Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Неыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу іншагародняя	— 20 к.
месцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нашпаралі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нашпаралі паспрад тэксту 1 р. — к.
За радок нашпаралі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. дарожэй.
Зьмест тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Бесспрадоўж. і чырвоньларкойцы за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 229 (2417) Чацьвер, 4-га кастрычніка 1928 г.

Іх словы і іх справы.

(З Масквы па радыё)

«Правда» ў палітагляндзе піша:

Уступная прамова „левага" Ленсбэры, гэтага салодзенькага пацыфіста і няшчырага сьвятошы, на зьезьдзе рабочае партыі ў Бірмінгаме сапраўды цікавая. У ёй што ні слова—дык перл. Даволі хоць мімаходам спыніцца на некаторых закранутых ім пытаньнях, каб лішні раз пераканацца ў глыбокай праўдзівасьці падкрэсьліваемага камуністамі тэзісу, што «левыя» пустабаі зьяўляюцца толькі фіранкаю для сваіх правых калегаў.

Містэр Ленсбэры заяўляе, што ён прыхільнік „справядлівасьці", а з гэтае прычыны трэба пазычаць гвалт камуністаў і рэвалюцыйную прафсаюзную меншасьць з рабочае партыі і іншых рабочых арганізацый. Ленсбэры ня толькі сумленны «дэмократ», ён вораг «гвалту» і, як такі, мае цудоўнае моцы рэцэпт, каб «абярнуць імпэрыялістычную імпэрыю ў аб'яднаньні вольных нацый без катастрафічных ляпрыемнасьцяў». Гэты талісман вымышчаецца, водгук слоў вэтэрана рэфармізму, у звычайнай формуле: «кідайце зброю!» Гэта пасьля актыўнага ўдзелу ангельскіх рэфарміста ў—і правых і «левых»—разам з сваёй буржуазеяй у крывавай сусветнай разьні, у расправах з тысячамі кітайскіх рабочых і сялян, усьпешных узброеньнях для падрыхтоўкі новых рабаўнічых войн і крыжавога паходу проці першае ў сьвеце пралетарскае дзяржавы!

Ці ня думае Ленсбэры, што выкарыстаўшы яго рэцэпт, рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу здолеюць адбіць наскок, які падрыхтоўваецца ўзброенымі да вубоў капіталістычнымі драпежнікамі? Ён сам прызнае, што СССР абкружан „бязьлітаснымі ворагамі", якія насупынна інтрыгуюць, наладжваюць змовы і працуюць над аднаўленьнем царызму". Ён нават прызнае, што «расейская рэвалюцыя—самая вялікая падзея ў сусьветнай гісторыі». Ён абяцае з гэтае прычыны рабочым і сялянам Савецкага Саюзу «прыязьнь» будучага «рабочага» ўраду, а пакуль што выказвае нездаволеньне, што ўрад кансэрватараў... зачыніў для ангельскага гандлю доступ на «расейскі рынак». Дык вось дзе злучаецца пацыфіскі «ідэалізм» з мяшчанскаю дзелавітасьцю адданага служкі капіталу.

Ленсбэры са звычайнаю для ангельскіх левых рэфарміста пяшчырасьцю навучае «зблізіцца» з калёніяльнымі народамі. Ён нібы ня ведае, як «рабочы» ўрад Макданальда ў свой час пасылаў пагражаючыя ультыматумы Індыі і Эгіпту, як рабочая партыя супрацоўнічае з кансэрватарамі ў камісіі Саймона і г. д. Абыходзіны будучага рабочага ўраду в Індыяй і наогул «падначаленымі расамі», кажа ён, зьявяцца «спробным каменем, па якім гісторыя будзе судзіць пра нас, як пра дэмократыю». Дарэмнае ханжэнскае мармытаньне.

Польска-румынскі ваенны саюз проці СССР

За час пабыту Пілсудзкага ў Румыніі, пад выглядам абароны ад савецкага нападу, распрацован шырокі плян процісавецкае авантуры з далучэньнем да яе Грэцыі і іншых балканскіх дзяржаў.

Захватчыкі Бэсарабіі ляскаюць зброяй.

ВЕНА, 2-X. Увесь румынскі друк прысьвяціў перадавіцы пабыту Пілсудзкага ў Бухарэсьце. Усе газэты падкрэсьліваюць «значэньне румынска-польскага саюзу для ўсяе Эўропы". Орган вайсковых колаў «Універсул» падкрэсьлівае, што „ўзброеньні СССР пагражаюць Англіі і Францыі здалёк, а Польшчы і Румыніі непасрэдна».

«Як-бы энэргічна ні праводзіла Румынія ваеннае падрыхтоўкі,—піша газэта,—яна ўсё-ж такі ніколі не зраўняецца з нявычарпанасьцю расейскіх рэсурсаў. У выпадку вайны на долю Румыніі прыпадзе роля даць ваенны адпор да прысылкі дапамогі ад саюзьнікаў. Вайну проці СССР могуць распачаць ня 2-3 дзяржавы, а толькі кааліцыя дзяржаў. Пры гэтым на долю Румыніі і Польшчы прыпадае роля заняць цэнтральны вучастак фронту проці савецкага наступу, а на долю іншых дзяржаў—заняць флянгавыя пазіцыі. Румынія павінна пашырыць ня толькі авіацыю, але і ўсю армію, і яна патрабуе запасу матар'ялаў».

Загавор проці СССР у Бухарэсьце

ВЕНА, 1-X. 29-га верасьня Пілсудзкі прыехаў у Бухарэст. Учора Пілсудзкі меў доўгую нараду з прэм'ерам Братыяну і міністрам замежных спраў Аржэтяну. Справа ішла аб магчымасьці распрацоўкі ўгаворнае сыстэмы між Польшчай і Румініяй.

Сёньня адбудзецца нарада з Пілсудзкім у румынскім вайсковым міністэрстве. У нарадзе возьмуць удзел румынскі вайсковы міністр, старшыня генэральнага штабу і польскі вайсковы прадстаўнік.

Як паведамляе аўстрыйскае агенцтва, палітычныя перамовы Пілсудзкага маюць на мэце ўцягнуць Грэцыю ў польска-румынскі саюз, а таксама пашырыць польска-румынскі вайсковы саюз і польска-румынскую абарончую сыстэму проці СССР да ўзьбярэжжа Чорнага мора.

Пілсудзкі скончыў „лекі".

ВЕНА, 2-X. Водгук афіцыйнага паведамленьня в Бухарэсту, урачыстасьці з прычыны пабыту Пілсудзкага ў Бухарэсьце скончыліся сёньня. Пілсудзкі выехаў у Варшаву.

БЭСАРАБІЯ АЖАБРАЧАНА

ВЕНА, 1-X. Орган румінскіх гаспадарчых колаў «Аргус» зьмяшчае сэрыю артыкулаў свайго спэцыяльнага карэспандэнта аб эканамічным крызісе ў Бэсарабіі. Карэспандэнт зазначае, што засеўная плошча ў Бэсарабіі скарачаецца штогоду. Суднаходзтва знаходзіцца ў поўным застоі. У гандлі і прамысловасьці—шматлікія банкроцтвы. Асабліва цяжка крызіс адбіваецца на сялянстве, якое ў некаторых мясцох Бэсарабіі перажывае востры голад.

Партыя Макданальда абярнулася ў капіталістычную партыю.

Поўны разрыў з прынцыпамі клясавае барацьбы

БІРМІНГАМСКІ ЗЬЕЗД ДАВОДЗІЦЬ ДА КАНЦА РАСКОЛ АНГЕЛЬСКАГА РАБОЧАГА РУХУ.

НА ЗЬЕЗЬДЗЕ АНГЕЛЬСКАЕ РАБОЧАЕ ПАРТЫІ.

БІРМІНГАМ, 2-X. Зьезд рабочае партыі пераважнаю большасьцю адхіліў прапанову дэлегата манчэстарскае арганізацыі Уіта ўнесьці папраўкі ў праэкт праграмы. Без галасаваньня адхілена падтрыманая дэлегатам рады прафсаюзаў Лідсу Братэртманам прапанова дэлегата арганізацыі рабочае партыі Гарвортсу адхіліць частку дакладу выканкому, дзе гаворыцца аб выключэньні арганізацыі Эджбэстону, а таксама Мозьлі з рабочае партыі.

Выканком рабочае партыі падаў на зьезд рэзалюцыю па пытаньні а б партыйнай «лёйяльнасьці». Буржуазны друк з захапленьнем вітае рэзалюцыю, як сродак „дапамагаючы канчаткова ачысьціць рабочую партыю ад камуністаў". У рэзалюцыі зазначаецца, што ўваходзячыя ў партыю арганізацыі і іх аддзелы ня маюць права высоўваць, ці падтрымліваць кандыдатаў на грамадзкія пасады проці афіцыйных кандыдатаў рабочае партыі. Дэлегатамі на нацыянальныя і мясцовыя зьезды рабочае партыі ня могуць быць абраны асобы, якія выступалі ў якасьці кандыдатаў проці кандыдатаў рабочае партыі, а таксама явія належаць да партый, не ўваходзячых у рабочую партыю. У статут усіх арганізацый, якія ўваходзяць у рабочую партыю ці блізкія ёй, павінен быць уведзен пункт аб непрыняцьці членаў палітычных партый, не дапушчаных у рабочую. Асобна зазначаецца, што гэта датычыць таксама членаў кампартыі.

Лідэр руху меншасьці Госіп, сэкратар аб'яднанага саюзу рабочых па выробу мэблі, прапанаваў адхіліць рэзалюцыю, бо гэта зьяўляецца спробаю расколу ангельскага руху. Госіп заявіў, што прадстаўлены ім арганізацыя не дазволіць нікому вырашаць пытаньня, каго ёй належыць пасылаць дэлегатам на зьезды. Калі зьезд ухваліць рэзалюцыю, дык гэтым давядзе да канца раскол рабочага руху.

Дэлегаты ад федэрацыі гарнякоў Дэвіс і Рычардсон баранілі рэзалюцыю выканкому. Дэвіс востра нападаў на Мэкстона і дамагаўся, каб члены палаты вобшчыны ад рабочае партыі, «якія вядуць здрадніцкую палітыку» былі-б зьняты з займаемае імі пасады. Рычардсон скардзіўся «аб нападках на Макданальда камуністаў».

Сэкратар лёндзанскае арганізацыі рабочае партыі і лідэр крайняга правага крыла Марысон, намечаны старшынёю рабочае партыі на будучы год, заявіў, што ў зьвязку з новаю выбарчаю тактыкаю кампартыі нельга дазволіць, каб камуністы прысутнічалі на зьездах рабочае партыі. Прапанова Госіпа пераважнай большасьцю адхілена.

Сэкратар незалежнае рабочае партыі Бракуэй падаў прапанову, падтрыманую Госіпам, каб адхіліць частку дакладу выканкому, у якой ухваляецца праца камісіі Саймона па абсьледаваньні становішча ў Індыі. Макданальд выступіў у абарону камісіі Саймона і заявіў, што парляманцкая фракцыя рабочае партыі «не намерана атрымліваць інструкцый ад арганізацый, якія стаяць па-за шэрагамі партыі, хоць-бы яны і завяралі, што гавораць ад імя індыйскага народу».

Член палаты вобшчын Тэрэль падтрымліваў прапанову Бракуэйя і заявіў, што камісія Саймона была спатканa ў Індыі з агідаю. Член палаты вобшчын Уэльлёк адхіліў завярэньні Макданальда, нібы парляманцкая фракцыя рабочае партыі адназгодна падтрымівае камісію Саймона, і напомніў, што шмат членаў парляманцкае фракцыі, у тым ліку ён, Уэльлёк галасавалі проці лініі партыі ў гэтым пытаньні. Прапанова Бракуэйя адхілена 2.259.000 галасамі проці 150.000 галасоў.

У левых колах бірмінгамскага зьезду зазначаюць на безьліч супярэчнасьцяй у прамове Ленсбэры, які на словах расьпінаецца за сацыялістычныя прынцыпы, каб на справе апраўдаць учынкі рэакцыянэраў. Што-ж датычыць часткі яго прамовы аб СССР, дык магчыма гэта зроблена, каб супакоіць левых.

Заява ангельскае кампартыі.

ЛЁНДАН, 2-X Кампартыя агаласіла заяву, у якой зазначае, што пададзеная на бірмінгамскі зьезд рабочае партыі новая праграма ператварае рабочую партыю ў трэцюю капіталістычную партыю і выкрывае яе, як ворага рабочае клясы. У Англіі—гаворыцца ў заяве,—засталася толькі адна партыя рабочае клясы—ангельская кампартыя.

Друк мусіць стаць арганізатарам мас НАВАКОЛ ПАРТЫІ.

(Рэзалюцыя па дакладзе тав. Молатава на ўсесаюзнай нарадзе рэдактароў.).

Усесаюзная нарада рэдактароў газэт цалком ухваляе палажэньні дакладу тав. Молатава.

Далейшыя посьпехі практычнага будаўніцтва сацыялізму, адпор спробам наступу кулацка-буржуазных элементаў, ажыцьцяўленьне асноўнае партыйнае лініі (цьвёрдае правядзеньне ўхваленага партыяй курсу індустрыялізацыі краю, уздым сельскае гаспадаркі сялянскіх мас, масавае кааперараваньне і разгортваньне калектывізацыі вёскі пры ўзмоцненым падтрыманьні будаўніцтва савецкіх гаспадарак, правядзеньне культурнае рэвалюцыі, наўхільнасьць барацьбы са шматлікімі ўплывамі на масы мяшчанска-буржуазнае ідэалёгіі, умацаваньне саюзу пралетарыяту і беднаты з асноўнымі масамі сялянства) магчыма толькі пры ажыцьцяўленьні на практыцы шырокага ўцягваньня рабочых мас і працоўных сялян—асабліва беднаты—ва ўсе галіны будаўніцтва, пры яшчэ больш настойчывым разгортваньні рабочае, і, у першую чаргу, унутрыпартыйнае дэмакратыі.

У зьвязку з гэтым у шмат разоў вырастае ЗАДАЧА ДРУКУ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ЗГУРТАВАНЬНІ ШЫРОКІХ МАС НАВАКОЛ ПАРТЫІ. Пры гэтым, правядзеньне надыходзячае ў цяперашнюю зіму кампаніі перавыбараў саветаў, якая ахопіць самыя шырокія колы працоўных, павінна стаць у цэнтры ўвагі савецка-партыйнага друку і абярнуцца ў кампанію мабілізацыі актыўнасьці мас наваколь бягучых задач сацыялістычнага будаўніцтва, ПАД ЛЁЗУНГАМ ДАЛЕЙШАГА І ЯШЧЭ БОЛЬШ РАШУЧАГА АЖЫЎЛЕНЬНЯ САВЕТАЎ.

УЦЯГВАНЬНЕ МАС У БУДАЎНІЦТВА, БАРАЦЬБА ЗА КАРАННОЕ ПАЛЕПШАНЬНЕ ДЗЯРЖАПАРАТУ І, У ЗЬВЯЗКУ З ГЭТЫМ, УЗМОЦНЕНАЯ БАРАЦЬБУ З БЮРАКРАТЫЗМАМ ПРАЛЕТАРСКА-КЛЯСАВАЕ ВЫХАВАНЬНЕ МАС НА ПАДСТАВЕ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ АКТЫЎНАСЬЦІ — гэтыя задачы патрабуюць наўхільнага і яшчэ больш энэргічнага, чымся да гэтае пары, АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ЛЁЗУНГУ САМАКРЫТЫКІ ПРЫ ЎДЗЕЛЕ Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ РАБОЧЫХ МАС. Друк павінен узмацніць барацьбу з бюракратычнымі скажэньнямі ў працы нашых органаў, сыстэматычна перамагаючы пры гэтым розныя спробы адпору далейшаму і посьлядоўнаму разгортваньню самакрытыкі на практыцы.

Посьпешнае праведваньне пралетарыяту па шляху сацыялістычнага будаўніцтва, зьвязанае з перамаганьнем супярэчнасьцяў і цяжкасьцяў пераходнага перыяду ва ўмовах краю з пераважаючым сялянскім жыхарствам, патрабуе ад кожнае партыйнае арганізацыі і ад кожнага камуніста НАПРУДЖАНАЕ ПРАКТЫЧНАЕ ПРАЦЫ НАД ВЫКАНАНЬНЕМ ПАСТАНОЎ ПАРТЫІ ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ВЫРАЗНАЕ ПАРТЫЙНАЕ ЛІНІІ І БАРАЦЬБЫ ПРОЦІ АПАРТУНІСТЫЧНЫХ УХІЛАЎ І ПРОЦІ ВЫЯЎЛЕНЬНЯ НЯСУМЯСЬЦІМАЕ З ЛЕНІНІЗМАМ ЦЯРПІМАСЬЦІ ДА ЎХІЛАЎ АД ЛІНІІ ПАРТЫІ. Неабходна ўзмацніць ідэйна-палітычную БАРАЦЬБУ ПРОЦІ СПРОБАЎ АЖЫВІЦЬ ТРАЦКІЗМ. У той-жа час неабходна больш рашуча правесьці ідэйную барацьбу проці іншых апартуністычных перабліставаньняў партыйнае лініі, аб якіх гаворыцца ў рэзалюцыі ліпэўскага пленуму ЦК УСЕПБ(б), разглядаючы гэтую барацьбу проці адкрытых і паўдакрытых апартуністычных хістаньняў, ЯК ГАЛОЎНУЮ ЗАДАЧУ, на падставе дырэктывы 6-га кангрэсу Камінтэрну аб узмоцненай барацьбе проці правых ухілаў.

Перад друкам у сучасных умовах з асаблівай вострасьцю паўстала задача ўзмацніць ідэйнае бальшавіцкае выхаваньне шырокае масы камуністаў, а таксама і шырокіх кадраў рабочае клясы ў цэлым.

Нарада рэдактароў прызнае, што ўсё ўзрастаючае значэньне савецка-партыйнага друку і ўсвядомленыя ўмовы яго працы патрабуюць усебакова ўзмацніць і палепшыць кіраўніцтва друкам з боку партыі, а, разам з тым, і ўсямерна ўмацаваць яго новымі кадрамі кваліфікаваных, зьвязаных з масамі і спраўды бальшавіцкі-загартаваных, працаўнікоў.

„КРАСІН" ПАДЫХОЗІЦЬ ДА ЛЕНІНГРАДУ

СКЛАД ЭКСПЭДЫЦЫІ «КРАСІНА».

МАСКВА, 2-X. У зьвязку са зваротам „Красіна" ў СССР паведамляем склад экспэдыцыі і камандаваньня лёдаколу.

Самайловіч—начальнік экспэдыцыі, *Орас*—намесьнік начальніка экспэдыцыі, *Чухноўскі*—камандзір самалёту 60. О. А. Э., *Страубэ*—другі пілёт, *Аляксеў*—лётнік-наглядчык, *Шалагін*—борт-мэханік, *Хведараў*—борт-мэханік, *Бярозкін*—гідролёг-сінoптык, *Іваноў*—сэкратар экспэдыцыі і *Дабравольскі*—радыстка-кароткахвалявік.

Каманда лёдаколу „Красін" складаецца з 118 чалавек, у тым ліку: *Эггі*—камандзір лёдаколу, *Панамароў*—галоўны памоцнік камандзіра, *Бачманаў*—другі памоцнік камандзіра, *Пятроў*—трэці памоцнік камандзіра, *Легзін*—чацьверты памоцнік камандзіра, *Сраднеўскі*—доктар на судне, *Яршоў*—галоўны мэханік, *Эйштэйн*—галоўны радыётэлеграфіст, *Кудзелька*—лоцман, *Салін*—галоўны рулявы, *Дзьмітраў*—вадалаз і *Веске*—галоўны машыніст.

НА ШЛЯХУ ДА ЛЕНІНГРАДУ.

ЛЁДАКОЛ «КРАСІН», 2-X. Праехалі Барнхольм. Плывём Балтыцкім морам з хуткасьцю 13 вузлоў. Каля Барнхольму сустрэлі параходы Совторгфлота «Декабрыст» і «Камо». Абмяняліся прывітаньнямі і салютамі.

ТЭКСТЫЛЬШЧЫКІ ЛІЛЮ ПАЧАЛІ БАСТАВАЦЬ.

ПРОЦІ БАСТУЮЧЫХ СЬЦЯГВАЮЦЦА ВЯЛІЧЭЗНЫЯ СІЛЫ ЖАНДАРМЭРЫ

ПАРЫЖ, 2-X. Не зважаючы на тое, што тэрмін ультыматуму пададзенага прадпрыемцамі лільскімі тэкстыльшчыкамі-унітарыямі, скончыцца толькі сёньня раніцою, ужо ўчора на некаторых фабрыках у Лілі частка рабочых спыніла працу.

«Юманітэ», заклікаючы працоўных Францыі дапамагчы бастуючым, піша: «Урад згрупаваў на поўначы вялічэзныя паліцэйскія сілы і перакідае ўсё новыя атрады з цэнтру Францыі. Штодня праз парыскія вакзалы праходзяць паязды з жандарамі, накіроўваючыся на поўнач. Улада, боячыся пашырэньня руху, выдае загады аб самай суровай расправе, каб паралізаваць забастоўку і тэрарызаваць рабочых».

У СССР ПРЫЕДЗЕ ДЭЛЕГАЦЫЯ ФРАНЦУСКІХ ГАРНЯКОЎ.

ПАРЫЖ, 2-X. Зьезд унітарнай фэдэрацыі гарнякоў у Сэнт-Эцьене ўхваліў пажаданьне паслаць у СССР дэлегацыю для азнаямленьня з умовамі працы.

ЗЬЕЗД ЖОЎТЫХ НЯМЕЦКІХ ФРАНТАВІКОЎ.

БЭРЛІН, 2-X. У Ганавэры адчыніўся зьезд «саюзу рэспубліканскага сьцягу», якім кіруюць сацыял-дэмакраты.

Ва ўступнай прамове галоўны кіраўнік саюзу, сацыял-дэмакрат Хервэ востра выступаў проці ўсенароднага галасаваньня па пытаньні аб пабудове панцырнага крэйсэра; яго прамова была перапоўнена вострымі нападамі на нямецкую камуністычную партыю, а таксама звычайнымі паклёпнымі выпадамі проці СССР.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў ГАМБУРЗЕ ЗАБАРОНЕНА.

БЭРЛІН, 2-X. Гамбурскі сэнат забараніў назначаную назаўтра дэманстрацыю кампартыі і чырвонага саюзу франтавікоў. Дэманстрацыя мела адбыцца ў знак пратэсту проці паскоку сяброў „саюзу рэспубліканскага сьцягу" на чырвоных франтавікоў, а таксама з мэтаю падтрымаць рух за ўсенароднае галасаваньне па пытаньні аб пабудове панцырнага крэйсэра.

ПРАВАКАТАР НЭЙМАН НА ВОЛІ.

БЭРЛІН, 29-IX. Вядомы па працэсе «нямецкае ЧК» 1925 г. Зэлікс Нэйман, на паказаньнях якога была абгрунтавана галоўная частка абвінавачэньня матар'ялу, зараз знаходзіцца на волі. Нэйман быў засуджан да пакараньня сьмерцю і пасьля амністыі быў пасаджан у астрог у Плятцэнзэі. Адзін з чыноўнікаў прыйшоў Нэймана ў больніцу, дзе яму павінны былі зрабіць прамываньне страўніка. Аднак Нэйману ўдалося ўхіліцца ад гэтае няпрыемнае апэрацыі і ўцячы з больніцы.

Як вядома, нямецкая кампартыя лічыць Нэймана правакатарам.

СТАЧКА 27.000 ГАРНЯКОЎ.

БЭРЛІН, 2-X. Дэлегацкая канфэрэнцыя саюзу гарнякоў Ніжняе Сілезіі абвяшчае з сёньняшняга дню забастоўку ў адказ на адмову прадпрыемцаў здаволіць патрабаваньні рабочых аб павялічэньні заработку на 5 проц. Забастоўка ахапляе 27 тысяч рабочых.

ПАЎГОДА ЗМАГАНЬНЯ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ НЬЮ-БЭДФОРДУ.

Нью-Ёрк, 2-X. Прадпрыемцы тэкстыльных прадпрыемстваў Нью-Бэдфорду прапанавалі бастуючым рабочым спыніць забастоўку на ўмове 5-ці процантнага вымяшэньня заработку, замест 10-ціпроцантнага, як памагаліся прадпрыемцы ўпачатку. Лідэры левага крыла выказаліся проці ўхвалы гэтае кампраміснае прапановы. Правае крыло абмежвалася прапановаю перадаць гэтае пытаньне на рэфэрэндум бастуючых.

Пераважаючаю большасьцю прапанова прадпрыемцаў адхілена. Такім парадкам, забастоўка, якая распачалася яшчэ 12-га красавіка, будзе цягнуцца далей.

Штукарства лёрда Кешэндэна.

Лёндан, 2-X. Урад заслухаў даклады міністэрства замежных спраў і марскога міністэрства наконт становішча, якое стварылася пасьля амэрыканскага адказу на англа-французскі марскі кампраміс.

У Лёндане агалошана такое афіцыйнае паведамленьне: „Ангельскі і французскі ўрады паведамілі вашынгтонскаму ўраду ўсю перапіску наконт англа-французкае марское згоды".

Газэта «Дэйлі Ньюс» піша, што гэтае паведамленьне ня вытрымлівае крытыкі, бо французкі ўрад толькі некалькі дзён назад рашыў вызваліцца ад апошніх западозраньняў Амэрыкі і перадаў амэрыканскаму паслу ўсю перапіску па гэтым пытаньні. "Такім парадкам,—піша газэта,—ангельскае паведамленьне зьяўляецца толькі „спосьвеным манэўрам, які ўяўляе сабою найбольш выдатнае штукарства, калі-небудзь паказанае ангельскім урадам. Абдуманая спроба паставіць нас у непапраўнае фальшывае становішча перад усім сьветам не магла-б быць ажыцьцёўлена лепш".

НАСКОК БАСТУЮЧЫХ НА ШТРЭЙКБРЭХЕРАЎ.

ЛЁНДАН, 2-X. У Мэльбурне (Аўстралія) бастуючыя докеры зрабілі наскок на штрэйкбрэхераў. Некалькі штрэйкбрэхераў паранена. Сярод бастуючых учынены арышты.

ПІРАТЫ Ў РАЙЁНЕ СІНГАПУРУ.

Лёндан, 2-X. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Сінгапуру: «У зьвязку з нядаўнымі выпадкамі піратства, параходы «Аннуі» і «Намсан», якія выплілі з Кітаю, маюць на борце ўзброеную варту".

УПАРТАЯ БАРАЦЬБА АЎСТРАЛІЙСКІХ МАРАКОЎ.

МЭЛЬБУРНСКАЯ СТАЧКА ШЫРЫЦЦА.

ЛЁНДАН, 2-X. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Мэльбурну: «Канфэрэнцыя саюзу маракоў і транспартных рабочых пераважаючаю большасьцю адхіліла рэзалюцыю за аднаўленьне працы і перадала ў надкамісію рэзалюцыю аб пашырэньні забастоўкі і забароне сябром прафсаюзу мець дачыненьне да тавараў, разгружаных даброхвотнікамі (штрэйкбрэхерамі); рэзалюцыя заклікае рабочых электрычных і газавых прадпрыемстваў быць гатовымі да выступленьня.

Маркуецца, што ў працягу бліжэйшага тыдню стануць усе параходы далёкага плаваньня».

БУРЖУАЗЕЯ Ў ЗАХАПЛЕНЬНІ АД СВАІХ „РАБОЧЫХ" САЮЗЬНІКАЎ.

ЛЁНДАН, 2-X. «Дэйлі Тэлеграф», абмяркоўваючы выбарчую плятформу рабочае партыі піша: «Бязумоўна, што з вялікага і недарэчнага дакументу выйдзе страва, прыгодная для ўсіх густаў». Макданальд і Лёйд Джордж будуць, як відаць, падтрымліваць блеф ад іх узаемнае незалежнасьці да і пасьля выбараў. Потым, магчыма, будзе ажыцьцёўлена дзелавая згода.

«Манчэстэр Гардыян» падкрэсьлівае, што ўхвала рэзалюцыі аб „партыйнай лёйяльнасьці і выгнаньне камуністаў палегчыць магчымасьць супрацоўніцтва між лібераламі і рабочай партыяй».

ВЭНІЗЭЛЁС ПАКІНУЎ АНГЛІЮ.

ЛЁНДАН, 2-X. Агенцтва Рэйтэра паведамляе, што Вэнізэлёс выехаў у Грэцыю. Па дарозе ён мае намер наведаць Швэйцарыю і Югаславію.

Урад цьвёрдалобых у Швэдыі.

ГАБІНЭТ ЛІНДМАНА НЯ МАЕ НАЛЕЖНАГА БАЗІСУ Ў ПАРЛЯМАНЦЕ.

СТАКГОЛЬМ, 2-X. Новы ўрадавы орган у Швэдыі «Свэнска Тагбляд» заўважае, што новы ўрад будзе ўмераным і будзе імкнуцца да згоды з іншымі буржуазнымі партыямі. Лібэральная «Даг Ньюхетэр» падкрэсьлівае выркую партыйную афарбоўку ўраду Ліндмана і адсутнасьць у яго належнага парляманцкага базісу. „Сацыял-дэмакратэн" лічыць, што згода Трыгера ўзяць партфэль міністра замежных спраў зьяўляецца гарантыяй, што крайняе правае крыло ня будзе мець вельмі вялікага ўплыву.

Урад агаласіў дэкларацыю, у якой, між іншым, зазначана: „Правыя палічылі сваім абавязкам, ня хістаючыся узяць у свае рукі ўрадавую ўладу і да межаў магчымага ўдзельнічаць у кіраваньні краем".

Гаміндан абмануў давер'е мас.

ПРЫХОДЗІЦЦА АБВЯШЧАЦЬ СТАЧКУ.

ШАНХАЙ, 2-X. Сёньня ў Шанхаі забаставала 3 тысячы паштавікоў. Усе паштовыя апэрацыі спынены. Саюз паштавікоў выпусьціў адозву, у якой зазначана: «Не зважаючы на ўздым, з якім мы сустракалі нацыяналістаў і дапамагалі ім, не зважаючы на тое, што нацыяналісты знаходзяцца ў Шанхаі ўжо паўтары гады, не зважаючы на тое, што мы няраз зварочваліся ў Нанкін,—становішча нашае пагоршваецца. Даводзіцца рабіць стачку.

БАМБАРДЫРОЎКА КІТАЙСКІХ ВЁСАК ЯПОНЦАМІ.

ШАНХАЙ, 2-X. Паведамляюць пра новыя выпадкі бамбардыроўкі японцамі вёсак уздоўж палатна Шандунскае чыгункі пад прыкрыцьцем «барацьбы з бандытамі». Шмат сялян забіта і паранена.

ЯПОНАФІЛЫ ВЫЦІСКАЮЦЦА З УСТАНОЎ.

ПЕКІН, 2-X. Учора скончылася забастоўка 2 тысяч пекінскіх паштавікоў пасьля таго, як камісар пошты абяцаў зволіць свайго намесьніка Лю-Яо-Ціна ў працягу 3 дзён.

Дырыжабль „Граф Цэпелін" ва ўладзе стыхіі.

ВЫМУШАНАЯ ЗЬМЕНА НАПРАМКУ ПАЛЁТУ.

БЭРЛІН, 2-X. Агенцтва Вольфа паведамляе: „Новы дырыжабль «Граф Цэпелін" вылецеў сёньня раніцою ў вялікі рэйд над Нямеччынаю, прычым меркавалася, што а поўдні дырыжабль будзе ў Бэрліне. Аднак, з прычыны дрэннага надвор'я ў паўднёвай частцы Нямеччыны, дырыжабль зьмяніў курс, павярнуўшы праз Бамбэрг на захад.

ДЫРЫЖАБЛЬ АДНЕСЕН НА ПАЎНОЧНЫ ЗАХАД АНГЛІІ.

ЛЁНДАН, 2-X. Агенцтва Рэйтэра паведамляе, што новы нямецкі дырыжабль «граф Цэпелін» (які вылецеў у палёт над Нямеччынаю, але зьмяніў у дарозе свой маршрут) а 21 гадз. 05 хв. пралящеў над Лёўстофам (паўднёвы ўсход Англіі) у паўночна-заходнім напрамку.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Беларускія паслы на вёсцы.

Паслы Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу выехалі было апошнімі часамі на вёску, каб паінфармаваць на мітынгах выбаршчыкаў аб сваёй працы. Намечана было зрабіць цэлы рад мітынгаў, спачатку пераважна ў тых мясцовасьцях, скуль паслы былі выбраны. 1Зверасьня меўся адбыцца мітынг у Навагрудку, куды паехалі паслы Я. Гаўрылік і Ф. Валынец, 19 верасьня—у Глыбокім (Гаўрылік і Валынец) і 20 верасьня—у м. Куранцы, Вялейскага п-ту (Валынец і Дварчанін). Былі пасланы паведамленьні адпаведным старастам і потым на месца паехалі і самі паслы.

Аднак, аніводнага мітынгу не ўдалося зрабіць. Мясцовая адміністрацыя не дазволіла. Такім чынам, паслом Бел. С.-Р. клюбу немагчыма сказаць праўду выбаршчыкам. Затое, гэтую магчымасьць маюць хадэцкія і сельсаюзьніцкія паслы і п. Я Станкевіч.

Кастусь Смакіла.

3 верасьня г. г. памёр вядомы з працэсу Грамыды Кастусь Смакіла. Ня гледзячы на тое, што ён быў 100 процантны інвалід і так моцна падупаўшы на здароўі, суд прыгаварыў яго на некалькі гадоў. Праз кароткі час сьдзеньня ў астрозе адміністрацыя даведалася, што яго ня ўтрымаць ня толькі што ў астрозе, але і на сьвеце, бо ён быў хворы на сухоты. Такім чынам яго выпусьцілі, каб памёр на «волі».

Сьмерць гэтай асобы агарнула сумам ня толькі вёсну, дзе ён жыў і памёр але і Ашмяніцу.

Рукамі сялян і сялянак быў сплецены з дамаросных красак вялікі вянок. Дарогу, па якой несьлі хаваць нябожчыка, хлопчыкі пасыпалі сечанымі яловымі лапамі, а дзяўчаты—красками.

Панскі суд у абароне абшарніка.

Віленскі акруговы суд разьбіраў гэтымі днямі справу Сьцяпана Вэйзэ, уласьніка фальварку Кавальні, Рудоміцкай вол., які забіў на ўласным полі работніка Гульбіновіча Марціна і параніў Станіслава Давейку.

Справа пачалася з таго, што памянёныя работнікі разам з двума сваімі таварышамі зайшлі ў агарод Вэйзэ і хацелі вынапаць некалькі радыскаў. Даведаўшыся аб гэтым Вэйзэ выскачыў з дому, стаў лаяцца і пагражаць стралянь, што ён і зьдзейсьніў. Суд прызнаў, што Вэйзэ страляў у абароне сваей асобы проці нападу і апраўдаў яго.

Трасеньне зямлі ў Галіцыі.

У Бучацкім павеце 24 верасьня г. г. адарылася трасеньне зямлі, якое трывала некалькі сэкунд і не зрабіла шкоды.

Катастрофы самалётаў.

Гэтымі днямі ў Варшаве здарылася катастрофа самалёту сыстэмы «Спад». Самалёт, будучы на вышыні 2000 мэтраў над Лазенкамі, стаў раптам падаць. На вышыні ня больш 200 мэтраў лётнік М. Даута выскачыў з самалёту з парашутам і шчасьліва спусьціўся на зямлю, параніўшы толькі нагу аб дрэва.

Другі выпадак катастрофы самалёту здарыўся ў Львове, дзе самалёт з вышыні 300 мэтраў зваліўся на страху будынку і павіс на рыштаваньнях. Два лётнікі ўратаваліся.

У САЮЗЕ ССР.

С.-г. калектыў 8-мі вёсак.

ВЯТКА, 2-X. У Яранскім павеце арганізавалася самая буйная ў губэрні калектыўная гаспадарка «Імя 6 кангрэсу Камінтэрну». У калектыўную гаспадарку ўваходзіць 8 вёсак, або 178 двароў. У карыстаньні гаспадаркі ёсьць 2 з паловаю тысячы гэктараў зямлі. Наркамзем прапануе губэрскай зямельнай управе дармова правесьці земляўпарадкаваньне калектыўнае гаспадаркі сёлета.

Правадыр нямецкіх чырвоных франтавікоў у Грозным.

ГРОЗНЫ, 1-X. У Грозны прыехаў правадыр чырвоных франтавікоў Нямеччыны тав. Вілі Леоў для перадачы сьцягу Берліна-Брандэмбурскае арганізацыі франтавікоў, над якой шэфствуе грозьненскі пралетарыят.

Крэйсэр „Камінтэрн" у водах Басфору.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 2-X. Прыплыў в Адэсы савецкі вучэбны крэйсэр «Камінтэрн». Камандзір крэйсэра тав. Каторсі наведаўся да губарнатара і прэфэкта Канстантынопальскага райёну, а таксама да камандуючага турэцкім флётам. Губарнатар і памоцнік камандуючага флётам у адказ наведаліся на крэйсэр.

Слова амэрыканскіх імпэрыялістаў.

Урад Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў зьвярнуўся з нотаю да ангельскага міністэрства замежных спраў адносна англа-французкай морской згоды. Амэрыканская дыплёматыя скупая на лішнія словы, але довады яе цяжкаватыя. Галоўнымі і найбольш пераконваючымі довадамі міністра Келёга зьяўляюцца амаль неабмежаваныя магчымасьці Амэрыкі хутка павялічваць свой марскі флёт.

Келёг пануляра растлумачвае, што марская згода ад пачатку да канца супярэчыць інтарэсам Амэрыкі. Амэрыцы патрэбны крэйсары з танажам дзесяць тысяч тон і больш, а згода прапануе для іх абмежаваньне. Амэрыка зацікаўлена ў прадастаўленьні ўсім дзяржавам поўнай свабоды манэўраваньня пры вызначэньні танажу розных катэгорый суднаў у межах агульнага танажу. Такім чынам, англа-французкая згода не падходзіць для амэрыканскіх імпэрыялістаў. Сваёй нотай Келёг падкрэсьлівае, што за Злучанымі Штатамі застаецца поўная свабода дзеяньняў, што Злучаныя Штаты зробяць усе высновы з утварыўшыхся міжнародных абставін.

На першы раз пытаньне аб марскіх узброеньнях стаіць у цэнтры ўвагі вялікіх дзяржаў. Барацьба за сусьветныя водныя шляхі вядзецца ў працягу дзесяцігодзьдзяў паміж буйнейшымі імпэрыялісцкімі дзяржавамі. Сучасная «марская дуэль» мае, бясспрэчна, буйнейшае палітычнае сусьветнае значэньне і выходзіць далёка за межы праблемы марскіх узброеньняў. Разгалосьсі па гэтаму пытаньню зьяўляюцца цэнтральным пунктам разгалосьсяў паміж Амэрыкай і Англіяй. Яны ўскрываюць глыбокія супярэчнасьці ва ўсім капіталістычным сьвеце.

У якіх абставінах разгортваецца барацьба паміж Амэрыкай і Англіяй?

Толькі што амэрыканскія банкіры і прамыслоўцы «ашчасьлівілі» чалавецтва вядомым пактам Келёга аб вечным міры. Яшчэ ў розных краінах тоўстыя часопісі займаюцца досьледам прававога, хрысьціянскага і ўсякіх іншых бакоў пакту Келёга; яшчэ пацыфісты і інстытуты, абываталі, мяшчане і наёмныя пісакі выхваляюць мудрасьць амэрыканскіх дзяржаўных асоб, набудаваўшых сабе пактам Келёга «помнік нярукатворны», і раптам увесь сьвет даведваецца аб англа-французкай марской згодзе. Гэта згода адным вострым бокам накіравана супроць Амэрыкі. Яна прыкрыта таямнічым флёрам.

Амэрыцы выгадна ў сучасных абставінах заняць вострую пазіцыю ў адносіне да Англіі і Францыі. Амэрыка груба, са зьдзекам адкідвае англа-французкай дыплёматыі, якая дужа зарвалася. Той факт, што Злучаныя Штаты заяўляюць, што яны «нічога ня маюць супроць падпісаньня Англіяй і Францыяй любой згоды, якую яны лічаць карысным у інтарэсах абмежаваньня ўзброеньняў», лепш усяго высьвятляе пазіцыю Амэрыкі. Яна дае зразумець сваім ворагам, што ёй ня страшны ваенныя блёкі, накіраваныя супроць Злучаных Штатаў. Злучаныя Штаты толькі дамагаюцца свабоды дзеяньняў, а нота Келёга праклямуе на ўвесь сьвет, што Амэрыка становіцца на гэты шлях. Прыпомнім, што ў бліжэйшы час у заатлянтычнай рэспубліцы пачнецца пабудова новых пятнаццаці магутных крэйсэраў. Прыпомнім, як шпарка павялічваецца ваенны бюджэт Амэрыкі. Гэта найлепшы адказ Англіі і Францыі.

На гэтым этапе разьвіцьця супярэчнасьці паміж Амэрыкай і Англіяй пераходзіць на новую ступень. Барацьба паміж імі пачынае набываць усё больш канкрэтныя формы. Сутычка па моры можа перайсьці ў сутычку ва ўзброеньне ў цэлым. Стрыманы, але ўпэўнены тон амэрыканскай ноты лішні раз пацьвярджае той факт, што Амэрыка хоча прымусіць ворага прызнаць яе перавагу.

Вельмі сымптоматычна, што амаль увесь ангельскі друк ня ведае, што рабіць. Нота Келёга ашаламаціла такія органы друку, як «Дэйлі Экспрэс» і «Дэйлі Хроніль». Увесь ангельскі друк пачынае біць адбой. Такая газэта, як «Дэйлі Хроніль» далікатна памякае, што англа-французкая згода была „найвышэйшай бястактнасьцю". Газэта «Дэйлі Ньюс» прапануе Англіі і Францыі: «падрыць свой вельмі каштоўны кампраміс і падзякаваць лёс за тое, што ён не пасьпеў яшчэ нанесьці канчатковы ўдар справе разбраеньня ўсяго сьвету».

Ніякія заклёны, ніякая чорная магія, ніякія малітвы фальшывага, прапаленага буржуазнага друку ня змогуць зьмяніць фактаў, бо «факты—ўпартая рэч». Газэта «Дэйлі Тэлеграф» выразна падкрэсьлівае, што згода паміж Англіяй і Францыяй «зайшла значна далей, чымся меркавалася». А орган рабочай партыі «Дэйлі Гэральд» прагаварыўся, што „ўсё прадказвае новы пэрыяд суднабудаўнічай канкурэнцыі, абвостранай дыплёматычнымі спрэчкамі".

На вельмі далікатнай мове Макдональда нясупынная падрыхтоўка да новай вайны завецца «суднабудаўнічай канкурэнцыяй», а далейшае абвастрэньне англа-амэрыканскай барацьбы за сусьветную гегемонію адзначаецца, як «абвастрэньне дыплёматычных спрэчак». Рабочыя масы павінны бачыць за гэтай гучнай палемікай сапраўдныя факты, а яны гавораць о новым і новым абвастрэньні супярэчнасьцяй у лягеры імпэрыялістаў, асабліва паміж Амэрыкай і Англіяй.

Дванаць два гады таму назад адзін з буйных палітычных дзеячоў Злучаных Штатаў—Тэадор Рузвэльт, у прамове ў Сан-Францыско заявіў: «Для Злучаных Штатаў прышоў час ажыцьцяўляць на тэй-жа падставе і такімжа спосабам, як вялікія Францыя, Нямеччына, Расея і Італія, сталы кантроль над лёсам усяго сьвету». Патомкі Рузвэльта—Кулідж і Келёг—праз дванаццаць два гады спадзяюцца ператварыць мары Рузвэльта ў сапраўднасьць. Яны хочуць у бліжэйшай будучыні хоць-бы кантраляваць Эўропу...

Англа-амэрыканская барацьба будзе вырашацца не ў габінэтах, не ў дыплёматычных нотах; аб ёй скажа яшчэ сваё слова міжнародны рэвалюцыйны пралетарыят.

N.

На Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Загатоўкі ідуць здавальняюча.

Бабруйск, 3-X. За апошнія 20 дзён верасьня месяца на Бабруйшчыне загатоўлена хлебазагатавіцельнымі арганізацыямі 18803 пуд. збожжапрадуктаў і 6746 пудоў лёнасэмя. Пляновае заданьне па загатоўцы збожжапрадуктаў, такім чынам, акавалася выпаўненым на 75 проц. і па лёнасэмю—на 56 проц.

З вялікім посьпехам праходзяць загатоўкі на Случчыне, дзе за апошнія 20 дзён верасьня загатоўлена болей 60 проц. агульнай лічбы загатоўленага хлеба.

Па якасьці працы сярод загатоўцаў на першым месцы стаіць Слуцкае аддзяленьне Белкаапсаюзу, здолеўшае перавысіць заданьне загатовак за верасень па збожжапрадуктах на 24 проц. і па лёнасэмю—на 60 проц. Вельмі кепска ідзе загатоўчая праца ў сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Процант выпаўненьня заданьняў дасягае толькі 28 процантаў і то не па ўсіх відах прадуктаў.

Даволі пасьпяхова праводзіць загатавіцельную работу аддзяленьне Саюзхлеба, спажывецкая каапэрацыя і Дааржгандаль. Выпаўненьне пляну збожжавых загатовак ідзе нармальна; ільняным-жа загатоўкі адстаюць ад пляну значна і патрабуюць да сябе большай увагі з боку загатоўцаў.

У апошні час на акрузе зазначаецца павялічэньне паступленьняў памольнага збору.

Мілён рублёў на індустрыялізацыю.

БАБРУЙСК, 2-X. Падпіска на 2 пазыку індустрыялізацыі па Бабруйшчыне на 1 кастрычніка дасягнула 1 мілёну рублёў. Такім чынам Бабруйшчына выканала сваё заданьне па рэалізацыі пазыкі з перавышэньнем на 52 процанты.

Пакуль што слаба ідзе афармленьне падпіскі і ўнясеньне першых узносаў.

Злачынная маруднасьць ГЭТ'у.

КЛІМАВІЧЫ, МАГІЛ. АКР., 3-X. Клімавіцкі завод па выпабу сілікатнае цэглы распачаў сваю працу яшчэ ў другой палове жніўня, і вось з гэтае пары ён ня можа даправіцца маньёўрам з менскага аддзяленьня ГЭТ'у (паслана 4 лісты і 4 тэлеграмы) для ўстаноўкі дынамамашыны, якая дала-б электраасьвятленьне.

На шаючы сьвету, завод працуе толькі ў адну зьмену, выробляючы ў дзень 16 тысяч цэглы. Да гэтага часу выпрацоўка складае каля 300 тысяч штук.

На сілікатную цэглу маецца валізарны попыт. Асінастрой просіць бязадкладна адгрузіць 300 тысяч штук (ён-жа адаслаў некалькі экземпляраў цэглы ў Масква для лябараторнага дасьледаваньня) і прапануе забраніраваць за ім яшчэ 800 тысяч.

Кіраўніцтва Заходніх чыгунак распачало перамовы аб пастаўцы яму 2 мільёнаў цэглы.

Завод адгрузіў 5 вагонаў для Навуково-Дасьледчага Інстытуту сельскай гаспадаркі (Менск) і столькі-ж на пабудову Дому Інвалідаў у Касьцюковічах.

Відуць перамовы аб пастаўцы цэглы і др. арганізацыі.

Сяляне таксама з ахвотаю разьбіраюць сілікатную цэглу на коміны (прададзена каля 5 тыс. штук).

Трэба як найхутчэй паставіць працу ў дзьве зьмены.

С.-г. каапэрацыя расьце.

МАГІЛЕЎ 2-X. За год лік каапэратываў, якіх яднае сельска-гаспадарчы саюз, павялічыўся на 63 адзінкі (акрамя калгасаў). Зараз налічваецца 163 каапэратывы.

У тым ліку: 50 крэдытных таварыстваў, 39—машынных, 33 садова-гародных, 15 — пчалярных, 18—насеннаводных, 8-сельска-гаспадарчых.

У іх пайшчыкаў—65.427, узрост за год—20 процантаў. Больш шпарка ўзрастаў паявы капітал, які павялічыўся на 50 процантаў і дасягнуў 324 тысяч рублёў.

Паляпшаем гаспадарку

ВОРША, 3-X. 1900 руб. ад пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі ў Багушэўскім раёне пайшлі ў мясцовы бюджэт, на якія набыта: клеверацёрка, завадзкі жарабец, кнур, 2 быкі, пераабсталяваны злучны пункт і на астатнія сродкі маркуецца набыць племяннога жарабца і 4 кнуры.

Новы цагельны завод.

ВІЦЕБСК, 2-X. Камтрэст распачаў пабудову новага, 4-га па ліку, цагельнага заводу па Сураскаму тракту, прадукцыйнасьцю ў 5 мілёнаў шт. цэглы ў год. Завод будзе мэханізаваны. Частка абсталяваньня ўжо паступіла. Будаўніцтва вядзецца з такім разьлікам, каб завод улетку 1929 г. распачаў працу

Крэдыты сялянству.

БАБРУЙСК, 3-X. *Апошнімі днямі Акрсельбанк адпусьціў для ўзмацненьня асноўных капіталаў крэдытных таварыстваў акругі 10 тысяч рублёў крэдытных сродкаў.*

Апрача таго, выдадзена 145 тысяч рублёў крэдыту на здавальненьне беднаты лесам.

Арганізуюцца групавыя сады.

БАБРУЙСК, 3-X. Акруговы зямельны аддзел у бягучым годзе ў новаарганізаваных пасёлках мяркуе правесьці закладку групавых садоў. Для гэтае мэты акруговае аддзяленьне сельска-гаспадарчага банку адпушчае крэдыт у суме 16 тысяч рублёў.

Працоўныя наладжваюць сувязь.

ВОРША, 3-X. 1-га кастрычніка з Амэрыкі ў Аршаншчыну прыехаў член амэрыканскай кампартыі т. Жольпэ Ф. Тав. Жальпэ прыехаў спэцыяльна для азнаямленьня з пастаноўкай працы сярод нацменшасьцяў, у прыватнасьці сярод літоўцаў, а таксама вырашыць пытаньне каконт дапамогі і замацаваньня сувязі паміж літоўцамі Амэрыкі і літоўцамі БССР. У Аршаншчыне г. Жольпэ наведае Асінастрой, дзьве вёскі Коханаўскага райёну і яўрэйскую камуну. Жольпэ—стары партыйны працаўнік, член суббюро кампартыі Злучаных Штатаў і літоўскай сэкцыі КП.

Дапамога прыватніку.

(Рагачэўскі р., Бабруйшчына).

Барацьба в прыватным гандлем па райёну не прыняла такіх размераў, якія патрабуюцца пастановамі нашага ўраду. А в боку Рагачэўскага РВК ёсьць нават палягчэньне прыватніку. Так, па прыватніка «райённага значэньня» Каплуна І. быў накладзен штраф за наўплату патэнтных збораў у суме 200 руб., Каплан падаў заяву ў РВК, і апошні час на акрузе зазначаецца павялічэньне паступленьняў памольнага збору.

Барысаўскі дом фізвыху гніе.

Барысаў, 3-X. На спорт-пляцоўцы ў горадзе Барысаве пастаўлен дзеравянны зруб, які прызначаўся пад дом фізвыху. Але-ж трэба зазначыць, што дом гэты не пакрыт дахам.

Бярвоньні гніюць. Ня гледзячы на тое, што ў каштарыс 1928-29 году ўключана 4000 руб. для сканчэньня гэтай будоўлі, чамусьці гэты выдатак акр. бюджэтнай камісіяй скарочан.

Рабочыя патрабуюць уключэньня гэтага выдатку ў каштарыс, бо ў іншым выпадку зруб гэты зусім згніе.

Чыя гэта справа?

У м. Смалявічы маюцца выключна прыватныя хлебапякарні, і хлеб з гэтых хлебапякарань прадаецца на рынку.

І вось на працягу двух тыдняў, а мо' і больш печаны хлеб з гэтых прыватных хлебапакарань прадаецца з пяском.

Усе скардзяцца на дрэнную якасьць хлеба, бо акрамя таго, што хлеб з пяском, ён у дадатак яшчэ дрэнна выпечан, усяроўна як ком.

І ніхто за гэту справу не бярэцца, ніхто аб гэтым ня думае, а ўжо пара ўзяцца і прыцягнуць каго трэба да адказнасьці.

м. Смалявічы, Меншчына.

На добрым шляху.

Чабатовіцкі камітэт узаемадапамогі працуе добра. Пры рэвізіі камітэту выявілася, што ў катітэце маецца грашыма адна тысяча руб. Камітэт закупіў шмат розных машын: 3 малатарні, 2 веялкі, 2 саломарэзкі, 3 лёнаталкі і шмат іншых. Заселу дзесяціну жыта ў п. Столпішча, закупіў 30 пудоў жыта і калійнае солі 30 пуд.

Гомельшчына.

Чаму не скарыстаны грошы?

Па Смалявіцкаму лясьніцтву маецца 4226 рублёў нескарыстаных на крэдытны лес, галоўным чынам па Варатоўскаму, Кляніцкаму і Верхменскаму с.-с. У гэтых сельсаветах маюцца хаты, якія не сягоньня—заўтра гатовы абваліцца, а ў лясьніцтве ляжаць нескарыстаныя грошы.

Калі немагчыма было грошы скарыстаць па гэтым с.-с., трэба было скарыстаць іх па другім, дзе ёсьць вялікая патрэба ў лесе.

Незабудка.

м. Смалявічы, Меншчына.

210 процантаў садавога заданьня.

Віцебск, 2-X. Ад пачатку загатоўчай кампаніі да 1 верасьня г. г., усе мясазагатоўчыя арганізацыі выканалі гадавое плянавае заданьне па масу на 210 процантаў.

Беднота паказвае прыклад.

Пасьля таго, як на агульным сходзе пасёлку «Арол», Ліпскага с.-с. была праведзена з сялянамі гутарка аб хлебазагатоўках, уся беднота аднагалосна выказалася за ўзмацненьне хлебазагатоўчай працы.

Заможнікі выступілі супроць хлебазагатовак, але беднота заможнікаў не паслухала і, арганізаваўшыся, калектыўназдала ўсе свае лішкі хлеба ў Ліпскі каапэратыў.

За прыкладам беднаты пас. «Арол» ідуць іншыя сяляне Ліпскага с.-савету.

Дружна папаўняем паі.

(Лядзянскі р., Аршаншчына).

Пайшчыкі Лядзянскага спажывецкага каапэратыву ахвотна папаўняюць свае паі да 10 рублёў.

Каапэратыў працуе добра і шмат у чым дапамагае беднаце. Каб не каапэрацыя, беднаце райёну вясной прыйшлося-б шмат пераплачваць за хлеб, бо на прыватным рынку хлеб быў дарагэй, як у каапэрацыі.

Зараз ідзе загатоўка хлеба, які скупляе толькі каапэрацыя.

Вока РСІ—у глыбіню вёскі.

Ворша, 3-X. Прэзыдыум АВК ухваліў арганізаваць сэкцыі РСІ ў наступных раёнах і сельсаветах: Талочынскім РВК і Маслакоўскім сельсавеце, Копыскім РВК і Нова-Тухінскім сельсавеце (Дубр. р-н), Шамаўскім сельсавеце (Мсьціс. р-н) і Ленінскім сельсавеце (Горацкі р.).

Навошта прынялі спэкулянта?

У Шклоўскім спажывецкім таварыстве „Селянін" працуе на сталай пасадзе, у якасьці загатавіцеля бульбы, былы буйны спэкулянт і гандляр Латарэйчык, які атрымлівае 90 руб. у месяц.

Цікава, з кім спажывецкае таварыства ўзгадняла пытаньне аб прыёме на работу спэкулянта.

Цікава таксама зьвярнуць увагу і па саюз Савгандальслужачых, які сьпіць 1 ня бачыць, што робіцца ў яго пад носам.

Шпілька.

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА АКРУГОВУ КП(б)Б.

Чарговы Пленум Менскага Акруговага Камітэту КПБ склікаецца 10 кастрычніка г. г. у малой залі клюбу імя Карла Маркса, а 6-й гадзіне ўвечары.

ПАРАДАК ДНЮ:

1. Становішча партарганізацыі і задачы на бліжэйшы пэрыяд (тав. СЛАВІНСКІ).
2. Бюджэт акругі (тав. ЯЦКЕВІЧ).
3. Аб загатоўках (тав. ГРАВІТ).
4. Становішча Нарасьветы ў акрузе (т. т. ЕРМАКОЎ і ЛЫСОЎ).
5. Інфармацыя аб ходзе падпіскі на 2-ю пазыку індустрыялізацыі (т. ТАНХІЛЕЎСКІ).

На Пленум, акрамя членаў і кандыдатаў АК, запрашаюцца члены і кандыдаты АКК, Рэвкамісіі і Сэратары РК КПБ, якія не зьяўляюцца членамі ці кандыдатамі АК.

Сэкратар АК КПБ СЛАВІНСКІ.

Да ведама дэлегатаў VIII-га Усебеларускага Зьезду Саюзу Будаўнікоў.

Рэгістрацыя дэлегатаў VIII-га Усебеларускага Зьезду Саюзу Будаўнікоў адбываецца ў памяшканьні ЦП Саюзу (Пляц Волі, Дом Працы, 3-ці паверх, пакой № 3)

4 кастрычніка—ад 9 гадз. раніцы да 11 гадз. увечары.

5 кастрычніка—ад 7 гадз. раніцы.

Прыбываючыя ў Менск дэлегаты VIII-га Усебеларускага Зьезду Саюзу Будаўнікоў павінны накіроўвацца ў 2-ю савецкую гасьцініцу (б. «Европа»)—Пляц Волі.

Адчыненьне VIII-га Зьезду адбудзецца 5-га кастрычніка а 7-й гадзіне ўвечары у памяшканьні клюбу «Савгандальслужачых» (рог вуліц Камуністычнай і Энгельса.)

Павялічым кадры вучоных і спэцыялістаў.

1 кастрычніка ў аўдыторыі нэрвовай клінікі адбыўся агульны сход навуковых працаўнікоў Бел. Дзярж. Унівэрсытэту. Быў заслухан даклад рэктара унівэрсытэту У. І. Пічэты аб выніках прыймовай кампаніі гэтага году.

Рэктар Пічэта застанавіўся на сацыяльным і нацыянальным падборы студэнтаў гэтага году, на працы з аспірантамі, на зьменах у складзе навуковых працаўнікоў і на беларусізацыі унівэрсытэту.

Рэктар зазначыў, што склад студэнцтва в боку пралетарызацыі унівэрсытэту з кожным годам паляпшаецца. Унівэрсытэт выканае свае задачы толькі тады, калі з яго муроў будуць выходзіць вучоныя і спэцыялісты па розных галінах гаспадаркі і культуры, вышэйшыя з пралетарыяту і бяднейшага сялянства. Курыяльная сыстэма, якую прымяніў Народны Камісарыят Асьветы ў адносінах да камплектаваньня вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў, цалкам сябе апраўдала, бо дала магчымасьць павысіць процант рабочых і бяднейшых сялян пры прыёме гэтага году.

Асабліва прыемнай зьявай рэктар унівэрсытэту лічыць штогодняе павялічэньне колькасьці сяброў КП(б)Б і ЛКСМ пры прыёме ў унівэрсытэт. Рэктар заклікаў навуковых працаўнікоў асабліва ўважліва адносіцца да вучобы партыйцаў; апошніх неабходна разгрузіць ад перагрузкі ў грамадзкіх абавязках, каб павялічыць іх час на вучобу.

Прысутнічаўшы на пасяджэньні Народны Камісар Асьветы А. В. Баліцкі выступіў з вялікай прамовай на тэму —«Праца вышэйшых навучальных устаноў у эпоху дыктатуры пралетарыяту».

— Справа замацаваньня дыктатуры пралетарыяту,—кажа тав. Баліцкі,— ёсьць у значнай ступені справа аўладаньня пралетарыятам і бяднейшым сялянствам усіх камандных ступеняў ва ўсіх галінах гаспадаркі, культуры і савецкага будаўніцтва. Перашкодай к гэтаму поўнаму аўладаньню зьяўляецца малакультурнасьць і недастатковасьць кваліфікаваных працаўнікоў, вышэйшых в пралетарыяту (вучоныя, інжынэры, аграномы, пэдагогі і г. д.). Сацыяльны адбор, які зараз робіцца пры залічэньні ў Вузы і тэхнікумы, зьяўляецца палітыкай, накіраванай на ўзмацненьне і замацаваньне дыктатуры пралетарыяту.

Нас абвінавачваюць абываталі і буржуазныя элемэнты ў пратэкцыянісцкай палітыцы пры камплектаваньні навучальных устаноў. Так, у нас палітыка пратэкцыянісцкая, але гэты пратэкцыянізм накіроўваецца не да асоб, а да цэлай клясы пралетарыяту. Толькі з гэтага пункту погляду мы падыходзім да кожнай асобы.

Заботы аб пралетарска-вытрыманай зьмене навуковых працаўнікоў зьяўляюцца важнейшай і найгалоўнейшай задачай унівэрсытэту. Самыя чуткія адносіны асабліва да партыйцаў маладых навуковых працаўнікоў. Прафэсура павінна перадаць ім увесь свой вопыт навуковай працы, падрыхтаваць сабе зьмену, а навуковым маладым працаўнікам-партыйцам трэба цьвёрда ўцяміць сабе, што не камандаваць прафэсарамі ў навуковых адносінах пасаджана яна, а вучыцца ў іх і добра вучыцца.

Па дакладу Пічэты выступалі праф. Гаўсман, праф. Кроль, праф. Леснаў і праф. Ленц.

Аз.

Недахопы ў галіне беларусізацыі прафсаюзаў.

На пасяджэньні Менскай акруговай нацкамісіі быў заслухан даклад культаддзелу ЦСПСБ аб беларусізацыі прафсаюзаў.

Якія дасягненьні ёсьць у гэтай галіне?

У апошні год маецца пералом у працы прафсаюзаў у сэнсе паляпшэньня беларусізацыі апошніх, што выявілася ў карэнізацыі адказнымі працаўнікамі ЦП, прафячэек і праўленьняў клюбаў, а таксама ў лепшым прыстасаваньні клюбнай працы да абслугоўваньня сяброў клюбаў на беларускай мове.

Усё-ж прыходзіцца адзначыць, што тэмп беларусізацыі прафсаюзаў яшчэ слабы. Так, саюзы хэмікаў, гарбароў, нархарчаваньня і некаторыя іншыя амаль што зусім не беларусізаваны.

Маюцца таксама выпадкі нядбайных адносін з боку цэнтральных праўленьняў і фабзавкомаў да правядзеньня і паглыбленьня беларусізацыі сярод саюзнай масы.

Акруговая нацкамісія зьвярнула ўвагу прэзыдыуму ЦСПСБ на неабходнасьць прыняць больш рашучыя меры да тых адказных працаўнікоў цэнтральных праўленьняў, клюбаў і нізавых прафячэек, якія нядбайна адносяцца да выкананьня дырэктыў адносна нацыянальнай працы.

Прафсаюзы павінны падумаць аб больш глыбокім правядзеньні беларусізацыі ў клюбнай працы шляхам арганізацыі сыстэматычных лекцый, дакладаў на тэмы гісторыі і літаратуры Беларусі.

Прафсаюзы савецкіх і гандлёвых служачых, а таксама працаўнікоў зямлі і лесу павінны быць прыкладам у галіне беларусізацыі для сваіх устаноў, а не цягнуцца ў хвасьце.

У заключэньне трэба сказаць, што пытаньне беларусізацыі прафсаюзы павінны паставіць у плян сваёй штодзённай працы, а не абмяжоўвацца кампанейскім падыходам да гэтага вельмі важнага пытаньня.

ЗЕРНААЧЫШЧЭНЬНЕ ПАВЯЛІЧЫЦЬ УРАДЖАЙНАСЬЦЬ

Важнасьць зернаачышчэньня.

Пры ўзьнядзі вытворчасьці малакультурнай сялянскай гаспадаркі ачыстка пасеўнага матар'ялу зьяўляецца адным з самых важных мерапрыёмстваў для падвышэньня ўраджайнасьці. Правільнасьць гэтага палажэньня даводзіцца шмат якімі досьледамі сьцьвярджаючымі, што адна ачыстка палёў ад сьмяцьцёвых расьлін можа павысіць ураджай на 25—30 проц. У гэты час самым тапным мерапрыёмствам па ачыстцы нашых палёў ад сьмяцьцёвых расьлін зьяўляецца ачыстка пасеўнага матар'ялу. Палепшаньне пасеўнага матар'ялу шляхам механічнай ачыстки дасягаецца двума спосабамі:—ачыстка насеньня ад прымешак і сьмяцьцёвых расьлін і сартаваньнем насеньня па катэгорыях дзеля падвышэньня вагі насеньня—„абсалютнай вагі".

На першаму спосабу, які носіць назву «чарнавой ачысткі», ачыстка насеньня праводзіцца на звычайных веялках прадольным качаньнем сітаў, альбо з дапамогай дадатковай рамкі з папярэчным качаньнем. Пры дапамозе веялкі можна ачысьціць насеньне толькі ад прымешак сьмяцьцёвых расьлін і то няпоўнасьцю—можа застацца зярно з засьмечанасьцю да 2-х проц.

Зусім другая справа пры ачыстцы насеньня другім спосабам—праз веялку-сартыроўку, альбо трыер. На гэтых машынах ачышчаецца насеньне ня толькі ад сьмяцьцёвых расьлін, але і сартуецца па шырыні і таўшчыні зярна.

Каб зразумець значэньне ачысткі пасеўнага матар'ялу, трэба прывесьці некалькі лічбаў, якія паказваюць, наколькі засьмечана насеньне ў БССР, у параўнаньні з іншымі райёнамі Савецкага Саюзу. Напрыклад, засьмечанасьць аўса і лёну, па даных Дзяржаўнай Хлебнай Інспэкцыі за 1926 г., была:

	Засьмечанасьць аўса ў проц.	Засьмечанасьць лёну ў проц.
УССР . . .	2,9	2,8
Арлоўская губ.	1,9	2,3
Тамбоўская губ.	1,5	4,5
БССР . . .	5,7	6,0

Такім чынам, засьмечанасьць нашага насеньня значна вышэй, чымся ў іншых райёнах Саюзу, і калі ў сярэдніх лічбах засьмечанасьць аўса даходзіць да 6—7 проц., дык у асобных гаспадарках яна значна вышэй і хістаецца ад 10 да 20 процантаў. Каб добра зразумець, якую шкоду дае гаспадарцы засеў неачышчаным зярном, для прыкладу прыводзяцца такія разьлікі. Адзін пуд неачышчанага зярна будзе мець такі склад: 5-6 фунт. зярнят сорных расьлін, 6-7 фунт. зярнят бітых і недасьпелых і 27-28 фунт. добрага насеньня (буйнае, сярэдняе і дробнае зярно).

Пры засеве 1 гэкт. такім насеньнем у ліку 12 пуд. на долю сьмяцьцёвых расьлін прыпадае 1 п. 20 ф., на бітае і няўсхожае насеньне—каля 2-х п. Зразумела, што высевам 1 п. 20 ф. сьмяцьцёвых расьлін поле засьмечаецца, і барацьба з сьмяцьцёвымі расьлінамі становіцца надзвычайна цяжкай, бо насеньне сьмяцьцёвых расьлін можа ляжаць у глебе 60 год і ня траціць сваёй усхожасьці; а калі сюды дадаць надзвычайную плаадавітасьць сьмяцьцёвых расьлін (5-6 тыс. зярнят з аднаго зярна), дык, зразумела, цяжкасьць барацьбы яшчэ павышаецца.

Шэраг досьледаў на сялянскіх палёх паказаў, што пры засьмечанасьці поля на 5-8 проц. ураджай зьніжаецца да 20 проц., а калі засьмечанасьць дасягае 12 проц., што ва ўмовах Беларусі звычайнае зьявішча, дык ураджай зьніжаецца да 36-40 проц. Адсюль вынік, каб нашы палі былі ачышчаны ад засьмечанасьці, селянін замест кожных 100 п. зярна атрымліваў бы 130 п.

Калі пры пасеўнай плошчы ў БССР, раўнай 3.000.000 гэкт. без бульбянога поля, падлічыць уплыў засьмечанасьці пасеўнага матар'ялу ў сэнсе недабору ўраджаю з 1 гэкт. 12-15 пуд., дык гэты агульны недабор будзе 36-45 млн. пуд., што ў пераводзе на грошы дае 40-50 мільёнаў руб. Гэтыя лічбы яскрава сьцьвярджаюць значэньне ачысткі насеньня ў справе павялічэньня вытворчасьці сельскае гаспадаркі, асабліва ў справе падвышэньня ўраджайнасьці

Сучаснае становішча ачысткі.

За апошнія 3 гады хоць ачыстка пасеўнага матар'ялу і павялічваецца, але ў адносінах да агульнай колькасьці высеваемага насеньня займае нязначны процант. Так, па гадох ачышчана зярна:

	1925 г.	1926 г.	1927 г.	1928 г.
Прапавала машын земорганаў, савгасаў і каапэрац.	779	1.417	1.435	1.721
Ачышчана насевматар'ялу (у тонах) .	23.451	30.105	33.294	37.769 (яравых)
У % ад агульна-высеваемага насеньня:				
а) яравых	8	16,9	21,1	25,0
б) азімых	—	3,6	4,5	—

Зразумела, такі нізначны тэмп зернаачысткі ня можа здаволіць нас на далейшы час, асабліва цяпер, калі ва ўсю вялічыню паставлена перад намі задача падвышэньня ўраджайнасьці. Чаму такі нізкі проц. ачысткі зярна? Таму, што мерапрыёмству па зернаачыстцы пасеўнага матар'ялу да 1928 г. мала аддавалася ўвагі. Зернаачысткай выключна займаўся агранам. Зразумела, пры слабай сялянскай самадзейнасьці, пры складаных абавязках агранома ён фактычна ня меў магчымасьці пашырыць справу зернаачысткі да належнай вышыні, і як вынік—**зернаачышчальная машына на працягу апошніх 4-5 гадоў скарыстоўваецца слаба.** На 1 зернаачышчальную машыну, прыкладна, прыпадае нагрузка ўсяго ў 22 тоны, у той час, як нармальна гэтая машына пры поўнай нагрузцы за 5-цімесячны пэрыяд працы можа ачысьціць у 2 разы больш.

Ужо ў мінулым годзе ў часе правядзеньня вясеньняй пасеўкампаніі, калі зернаачышчэньню быў нададзен характар масавай кампаніі, калі ў справу зернаачысткі былі ўцягнуты ня толькі зямельныя органы, а і ўсе арганізацыі вёскі, мы мелі значнае павялічэньне тэмпу зернаачышчэньня. Але вынікі мінулага году не характэрны, бо недарод яравых культур таго году значна перашкаджаў пасьпяховаму разгортваньню зернаачышчальнай кампаніі.

Што трэба зрабіць у далейшым.

Выходзячы з важнасьці задачы падвышэньня ўраджайнасьці ў бліжэйшы пэрыяд, мы павінны выкарыстаць усе шляхі да максымальнага павялічэньня ачысткі збожжа. Шлях да павялічэньня ўраджайнасьці ўжо знаём сялянству і яго трэба выкарыстаць у першую чаргу. Наліччa зернаачышчальных машын на пракатных пунктах земорганаў, савгасаў, калгасаў, камітэтаў сялянскай узаемадапамогі (звыш 2000 зернаач. адзінак—сарціровак і трыераў) дазваляе давесьці ачыстку збожжа **да 50 проц. усяго высеваемага насеньня яравых культур, што складае звыш 600000 пуд.** Гэту задачу мы павінны паставіць перад вясеньняй пасеўкампаніяй 1929 г. і выканаць яе на ўсе 100 проц. Наліччa зернаачышчальных машын, асабліва калі прыняць пад увагу, што на папаўненьне зернаачышчальных пунктаў усіх арганізацый і органаў у бягучым годзе завозіцца па лініі гандлюючых арганізацый каля 2000 шт. сарціровак і трыераў, дае магчымасьць правесьці ачыстку 50 проц. усяго пасеўнага матар'ялу.

Але для пасьпяховага вырашэньня гэтай задачы мала толькі наліччa машын: неабходна падняць самадзейнасьць насельніцтва і арганізаваць справу зернаачысткі, так, каб ні адзін дзень машына не заставалася бяз працы. Дзеля гэтага мы павінны ўсю арганізацыйную працу па разгортваньню зернаачышчэньня з бягучага году паставіць на новыя рэйкі і неадкладна правесьці наступныя мерапрыемствы:

Па усіх лініях савецкай грамадзкасьці паставіць задачу правядзеньня зернаачысткі да вызначаных разьмераў, і за справу зернаачысткі павінны адказваць ня толькі аграномы, але кожны працаўнік райёну, сельсавету і ўся грамадзкасьць вёскі.

Працу па зернаачыстцы распачаць з пачатку лістапада, а ня ў студзені і лютым, як гэта было ў папярэднія гады.

З наступленьнем марозаў перавесьці ўсе зернаачышчальныя машыны стацыянарных пунктаў у перасовачныя абозы, што прыблізіць машыну да селяніна

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

КРЫШЫЦКАЯ ШКОЛА—ПРЫКЛАД ІНШЫМ.

(Юравіцкі р., Мазыршчына).

Усім добра вядома, што наша вясковая школа ніяк ня можа наладзіць вучэбнага году з набліжэньнем яго да нармальнага, ад чаго з гэтым ў год застаюцца цэлыя разьдзелы праграмы ня выкананы и, або зусім павярхоўні іх прабягаюць. Гэтым хваробяць асаблівы школы аднакамплектавыя ды яшчэ пры чатырох групах.

Гэты год паказаў, што вучэбны год можна, хоць яшчэ і не ва ўсіх школах, павялічыць на 1—2 месяцы.

Гэта паказвае практыка нашага Юравіцкага райёну.

Крышыцкая 2-хкамплектавая школа, якая працуе ўсяго другі год, пры належнай падрыхтоўцы з боку настаўнікаў распачала заняткі з 1 верасьня. Штодня ў школу ходзіць да 80 чалавек дзяцей, амаль што поўная нагрузка.

Трэба сказаць, што вёска Крышычы нічым ад іншых не адрозьніваецца, а значыць, пры належнай падрыхтоўцы можна дабіцца значных вынікаў і ў іншых школах.

Я. Ж.

Непарадкі на асьветніцкім фронце.

(Дубровенскі райён, Аршаншчына).

Зараз мы маем шмат настаўнікаў, якія скончылі савецкія ВНУ і спэцыяльныя тэхнікумы; яны ня маюць добрую падрыхтоўку ў галіне школьна-выхаваўчай справы, і трэба быць упэўненымі, што гэтыя настаўнікі не пакалечаць дзяцей.

Ёсьць у нас і старыя настаўнікі, скончыўшыя атпаведныя пэдагагічныя ўстановы і ступіўшыя на шлях новых мэтадаў выхаваньня дзяцей; на гэтых таксама можна спадзявацца.

Трэція—гэта выпадковыя настаўнікі, якія па гэту працу найшлі з прычыны свайго беспрацоўя; яны ня маюць патрэбных пэдагагічных ведаў, а таксама далёка ня ўсе з іх адпавядаюць духу сучаснай працоўнай школы. Вось на гэтых настаўніках нам трэба больш застанавіцца.

У Дубровенскім райёне працуе шмат выпадковага настаўніцтва.

Напрыклад, былыя ліквідатары няпісьменнасьці і загадчыкі лікпунктаў зараз занялі пасады сталых настаўнікаў у школах сацвыху. Скончыўшыя сямігодкі ў 20-25 годзе, працуюць на пасадах настаўнікаў. Выкінутыя па розных прычынах з пэдтэхнікуму таксама добра ўладжаны працаваць на асьветніцкім фронце.

Лёля Ляшкевіч—па сацыяльным становішчы дачка папа,—ня маючы належнай асьветы, да гэтага году была настаўніцай. Яе матка таксама працавала настаўніцай, а бацька кадзіліў у царкве.

Ляшкевічы былі пад апекай загадчыка культ. аддзелам акр. савету прафсаюзаў т. Шумейкі.

Закаранелая ў рэлігійным духу савінская пападзьдзя займала месца настаўніцы, і тут ахова загадчыка РайАНА т. Баўтунова. Камсамольская і парт. ячэйкі вёскі Савіна доўгі час перакопвалі райённы адз. нар. асьветы, што старая пападзьдзя не адпавядае прызначэньню настаўніцы, але паперкі і засталіся паперкамі.

Цікава застанавіцца на Ганчароўскай настаўніцы. Ня памятаю яе прозьвішча, але добра ведаю, што яе завуць жонкай Н. Тухінскага фэльчара. Факт здарыўся ў леташнім годзе ў сьвяткаваньне Чырвонага Кастрычніка.

Гэта настаўніца раздавала вучням падарункі на цукерку і абаранку. На настаўніцу напаў нейкі ліхі зуд, і дачку камуніста Чамахоненкава яна абдаяліла. Запыталася настаўніца—ці ўсе атрымалі падарункі, і зараз-жа вучні адказалі, што Чамахоненкава не атрымала. Запыталася настаўніца ў другі раз, і ў другі раз адказ быў той самы. Настаўніца змоўкла, але-ж ня змоўкла Чамахоненкава. Спазмы здушылі дзіцяці горла ад крыўды, і надалейшы час яна не жадала хадзіць у школу. Скардзілася яна, што ўвесь час адносіны да яе настаўніцы былі кепскія. Чамахоненкаву крыўдзілі вучні, а ў настаўніцы—вочы нібы завязаны. Гэта настаўніца зимушае сумняваецца ў яе пэдагагічным такце.

Што-ж робіць райённы інспэктар Баўтуноў?

А ён нічога ня робіць. Яго справа маленькая: расквітацца з настаўнікамі пэнсіяй і дамаць належныя ўказаньні ў бу вань-і Баброўскай школы, якая ўжо будуецца поўдзесятка гадоў і ўсё яшчэ не дабудавана. Сёлета прыслалі на працу ў Дубровенскі райён скончыўшых пэдтэхнікумы. Усіх іх налічвалася чалавек 13. Замест таго, каб зрабіць прагляд сваіх настаўнікаў, Баўтуноў проста піша на паперах маладых настаўнікаў, што для працы ў Дубровенскім райёне на пасадах настаўнікаў іх вельга скарыстаць.

Усё гэта кажа за тое, што справа народнай асьветы ў Дубровенскім райёне неўпарадку.

Зьлісееў.

Сваякі на---першым месцы.

(Ветрынскі райён, Полацкай акругі).

Добра жыць у нашым райёне тым настаўнікам, якія ў РВК маюць радню.

Тады ім можна выбіраць любое месца і працаваць навольна.

Калі настаўнік Б. прасіў РВК аб пераводзе яго ў Ветрынскую сямігодку і выстаўлаў к таму важныя матывы, дык яму адмоўлена на адсутнасьцю вакансіі. Але-ж для настаўніцы Люцька, жонкі сэкратара РВК і швагеркі старшыні рэвкамісіі вакансія знайшлася.

Параўнаем становішча Б. і Люцька.

Б.—стажыраваны настаўнік, у Ліцьвінаўскай школе працуе 5 год. Сям'я яго з 6 чалавек прымушана жыць у трох месцах: адна дачка вучыцца ў Полацку, дзьве ў Ветрынскай сямігодны.

У Ветрыне-ж жыве і рэшта яго сям'і, і толькі ён адзін працуе і жыве ў Ліцьвінаўскай школе ў 12 вярстох ад Ветрына. Пры сучасных умовах, якія-ж трэба сродкі, каб утрымаць тры сям'і?

Апрача таго, і здароўе яго за 26 год настаўніцтва падкасілася і патрабуе часта моддапамогі, якую можна атрымаць у Ветрыне хутчэй, чымся ў глухой в. Ліцьвінава.

Люцька, яшчэ маладая жанчына, за 3 гады свайго настаўніцтва мяняе ледзь не чацьвертую школу. Людзі яны адзінокія, забясьпечаныя. Але-ж—свайство.

Далей. У Вароніцкай школе таго самага райёну працавалі Долатавы—муж і жонка. Месца гэта патрэбна стала б. інспэктару Лісоўскаму, які паехаў вучыцца, а жонку сваю нажадаў перавесьці ў Варонічы, дзе яе бацька «працуе» ў Варанецкай царкве дзяком. І вось, Долатавых перакідваюць у Рудню за 15 вёрст, а ў Варонічы прызначаюць Лісоўскую і інш., хто спадабаўся РВК.

Пры ўкамплектаваньні школ дапускаюцца таксама і пратэкцыі і інш. спосабы, якія не павінны былі-б быць дапушчаны ў краіне працоўных. Дзякуючы гэтаму, ня гледзячы на пачатак навучальнага году, пераўкамплектаваньне школ яшчэ і зараз у поўным разгары.

Асьветнік.

Настаўнікі-краязнаўцы

(Чавусы райён, Магілеўшчына).

9-га верасьня г. г. у нас адбылася райённая краязнаўчая канфэрэнцыя.

Са справаздачы старшыні бюро т. Камінскага відаць, што праца краязнаўчага бюро была зусім не разгорнута, дзякуючы непрацаздольнаму складу яе. Ня не аб'ядноўвае нават той актыў зацікаўленых працаўнікоў, які ёсьць у райёне і які правёў значную працу па лініі школьнага краязнаўства.

Характэрна, што сама канфэрэнцыя склікана на ініцыятыве райённага мэтадычнага бюро і што стары склад бюро краязнаўчага таварыства ініцыятывы наогул не выяўляе.

Настаўнік Сапун сабраў да 437 народных сьпевак. Некаторыя таварышы сабралі частку сацыяльна-гістарычнага матар'ялу з часоў прыгону, з рев. руху 1905 г. і з часоў Лютага і Кастрычніка на Чавускім райёне, аб чым і ня ведала старое бюро.

Новаабраному складу бюро даўзены наказ ад аб'яднаньні актыву, выпрацоўцы адпаведных плянаў працы і аб выкананьні іх.

К.

Навучальны год своечасова не распачалі.

(Самахвалавіцкі р., Мен. акругі).

Пытаньне адносна нармальнага пачатку заняткаў у вясковых школах шырока абгаварвалася ў друку. Цэлы шэраг дырэктыў вышэйстаячых устаноў гаварыў за тое, што навучальны год павінен пачацца своечасова. Але дырэктыва—гэта адно, а сама праца—другое. 23 верасьня на раённай канфэрэнцыі асьветнікаў райінспэктар заявіў, што 50 проц. школ заняткаў яшчэ не пачыналі, частка школ яшчэ неўкамплектавана і г. д.

З боку самога РВК ёсьць значная затрымка ў гэтым напрамку: толькі 26 верасьня вынесена пастанова аб правядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня ў некаторых пунктах, ну, а пакуль дойдзе на месца, дык будзе 1 або 5 кастрычніка.

Вось, як Самахвалавіцкі райён падрыхтоўваўся да навучальнага году.

Падручнікамі школы забясьпечаны слаба, а лемантароў дык і зусім ня прывезьлі; некаторыя школы зусім без лемантароў.

К.

Нельга адбіраць дзень адпачынку.

(У парадку прапановы).

Кожны працаўнік тэй ці іншай установы, папрацаваўшы шэсьць дзён у тыдзень, павінен мець сабе дзень адпачынку. Але, на вялікі жаль, ня ўсе працаўнікі маюць сабе гэты дзень адпачынку.

Як вядома, вясковыя школы вельмі часта знаходзяцца ад райёнаў вёрст на 15-20. Дзеля таго, каб атрымаць пэнсію, настаўнік павінен патраціць або працоўны дзень, або дзень адпачынку.

Працоўны дзень настаўнік патраціць ня мае права, бо заняткаў зрываць нельга, гэта бязумоўна. Трацільжа свой дзень адпачынку на атрыманьне пэнсіі настаўніку таксама нявыгадна і нельга яго на гэта змушаць.

Каб зьнішчыць такое становішча, трэба, каб райвыканкомы перасылалі настаўніцкую пэнсію па сельсаветах і там настаўнікі змогуць яе атрымаць.

Адпаведныя органы павінны зацікавіцца гэтым пытаньнем.

Настаўнік.

У ЦП САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

Вячэрнія паліткурсы.

Цэнтральнае Праўленьне Саюзу Працасьветы адчыніе пры Цэнтральным доме асьветы вячэрнія паліткурсы павышанага тыпу для гарадзкіх асьветнікаў. У праграме курсаў—палітэканомія, дыялектычны матар'ялізм і гісторыя рабочага руху.

Рэарганізацыя групкомаў.

Зараз ЦП саюзу праводзіць працу па разбудаваньні гарадзкіх групкомаў Менску. У тых установах, дзе налічваецца 25 і больш членаў саюзу, будуць утварацца самастойныя месцкомы.

Гадавыя паліткурсы.

ЦП саюзу дало дырэктывы аб адчыненьні ва ўсіх акруговых гарадох палітурсаў павышанага тыпу для настаўнікаў. Праграма курсаў разьлічана на адзін год.

Дапамога райённым асьветнікам.

ЦП саюзу набыло 600 праграм для самаадукацыі па палітасьвеце для райённых асьветнікаў. Гэтыя праграмы ў бліжэйшым часе будуць накіраваны на месцы.

МЭТАДЫЧНЫЯ ПАДСОБНІКІ.

Выйшлі з друку 5 мэтадычных зборнікаў: самаарганізацыя і грамадзка-карысная праца, матэматыка ў комплексным сыстэме, мова ў комплексным сыстэме, ахова здароўя ў школе і праграма і мэтадычны дапаможнік для настаўнікаў лікпунктаў.

Наша перапіска.

ВЫХАВАНЦАМ. Бабруйшчына. Ваш допіс „Чырвона-Бярэзы гэрой" рэдакцыя перасылала ў Наркамасьветы дзеля праверкі. Як паведамляе Інспэктарыят Подаг. Асьветы, факты, пералічаныя ў вашым допісе, праверкай не пацьвердзіліся. Друкаваць ня будзем.

М. ГУТАРАВАЙ-СЬВІСТАК. Шклоў. У дадатак да нашага адказу на вашу заяву аб незаконным пераводзе на вёску («Працаўнік Асьветы» № 8), Магілеўскае акрпраўленьне саюзу працасьветы тлумачыць, што вас перакідалі на вёску ў зьвязку з перакідкай са Шклову двух камплектаў вашае школы. Аказалася-ж, што намечаныя два камплекты з гораду на вёску не пераводзяць, і таму вы застаецеся на сваім старым месцы.

Я. КРУШЫНУ. Рагачэўскі р. На ваш допіс „Сямігодка без спэцаў" Рагачэўскі райінспэктарыят дае наступнае тлумачэньне: 1) У Цікінскай школе працуе стары загадчык Сурапінкі; 2) Мельнік прызначан не на пасаду загадчыка, а выкладчыкам грамадазнаўства і свайму прызначэньню поўнасьцю адпавядае; 3) Храмянкоў не назначан загадчыкам гэтай школы толькі таму, што там працуе яго жонка і швагер, і таму магі-б быць некаторыя ненармальнасьці ў школьных справах. Настаўнікам-жа працаваць там Храмянкоў адмовіўся.

МОЗІКАВУ А. Рагачэўскі р. Ваш „Лист у рэдакцыю" перасылаў ў Наркамасьветы.

У Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

1-га кастрычніка 1928 г. пад старшынствам тав. А. Г. Чарнякова адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК БССР. Разам з іншымі разглядваны наступныя пытаньні:

АБ АСНОВАХ ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЯ І ЗЕМЛЯКАРЫСТАНЬНЯ.

Заслухан даклад Народнага Камісара Земляробства БССР т. Прышчэпава аб выніках абгаварэньня ў БССР праэкту Саюзнага закону аб асновах землеўпарадкаваньня і землякарыстаньня.

Прэзыдыум ЦВК, улічваючы заўвагі з месц, а таксама і заўвагі Наркамземляробства, прыняў адпаведнае заключэньне па праэкту Саюзнага закону; унесены паасобныя папраўкі ў некаторыя артыкулы паказанага праэкту.

Разам з тым Прэзыдыум ЦВК канстатаваў, што асновы земельнага заканадаўства БССР, якія знайшлі сваё прызначэньне ў жыцьці, саўпадаюць з праэктам Саюзнага закону аб землеўпарадкаваньні і землякарыстаньні.

Пастанова Прэзыдыуму ЦВК БССР па гэтым пытаньні разам з дакладам Наркамземляробства і зборам усіх заўваг з месц накіроўваюцца ў тэрміновым парадку Прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР.

Наркамземляробства даручана ўсе матар'ялы па пытаньню абгаварэньня Саюзнага закону перадаць Навукова-Дасьледчаму Інстытуту імя Леніна ў кабінэт аграрнай палітыкі.

Стэнаграма дакладу тав. Прышчэпава аб выніках абгаварэньня ў БССР праэкту Саюзнага закону аб асноўных началах землеўпарадкаваньня і землякарыстаньня ў БССР будзе, згодна пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР, зьмешчана ў цэнтральным рэспубліканскім друку.

АБ ВЫНІКАХ АГРАРНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ Ў БССР.

Прэзыдыум ЦВК прызнаў неабходным пастаноўку пытаньня аб вывучэньні вынікаў аграрнае рэвалюцыі ў БССР ва ўсіх адносінах. ЦСУ і Наркамземляробства дадзена даручэньне аб распрацоўцы адпаведных матар'ялаў па гэтым пытаньні.

АБ ПАВЯЛІЧЭНЬНІ НОРМЫ ПРАДСТАЎНІЦТВА У СЕЛЬСКІЯ І МЕСТАЧКОВЫЯ САВЕТЫ БССР.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў пастанову аб зьмене арт. 3 Палажэньня аб сельскіх саветах і арт. 3 Палажэньня аб местачковых саветах.

Згодна гэтай пастановы, сельскія, а таксама і местачковыя саветы выбіраюцца па разьліку—адзін дэпутат ад 100 чалавек насельніцтва, замест раней існаваўшай нормы прадстаўніцтва 1 дэпутат ад 200 чалавек насельніцтва.

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯЦЕ ПРАЦЫ БССР.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў новае Палажэньне аб Народным Камісарыяце Працы БССР.

ПРА ПАДАТКОВЫЯ КАМІСІІ.

Зацьверджана пастанова ЦВК і СНК БССР пра склад падатковых камісій. Згодна зацьверджанае пастановы, для вырашэньня спраў па прамысловаму і падаходнаму падаткам, па звышпрыбытку і гербаваму збору арганізуюцца аб'яднаныя падатковыя камісіі: вучастковыя, асобныя і акруговыя.

У паказанай пастанове вызначаны правы і абавязкі кожнай з гэтых камісій.

АБ ПАЕЗДЦЫ СЭКРАТАРА ЦВК БССР ТАВ. ХАЦКЕВІЧА Ў МАСКВУ НА ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ ІНСТЫТУТУ САВЕЦКАГА БУДАЎНІЦТВА ЦВК САЮЗУ ССР І УЦВК.

Прэзыдыум ЦВК БССР прызнаў неабходным паездку, згодна запрашэньня, тав. Хацкевіча ў Маскву для ўдзелу ў пасяджэньнях Пленуму Інстытуту Савецкага Будаўніцтва ЦВК Саюзу ССР і Усерасейскага ЦВК.

Згодна гэтае пастановы, тав. Хацкевіч выехаў 1 кастрычніка ўвечары ў Маскву.

ХРОНІКА.

За скажэньне нацпалітыкі—да адказнасьці.

Менская акрнацкамісія канстатавала, што сьледзтам пацьверджаны факты зазакіты і грубага парушэньня нацпалітыкі з боку нарсудзьдзі 3 вучастку т. Кагана, сакратара гэтага суду т. Май і нарсьледчага 4-га вуч. т. Ізраеліта.

Справа аб нарсудзьдзі т. Кагане накіроўваецца ў АКК для прыцягненьня да адказнасьці па партлініі. Нарсьледчаму т. Ізраеліту абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем.

Разам з тым акрнацкамісія ўказала акруговаму пракурору на недапусьціманасьць затрыманьня гэтай справы ў працягу 3-х месяцаў без прыняцьця належных мер упляву.

Пабудова вучэбнага самалёту „Школьнік".

Нар. Ком. Асьветы БССР сумесна з Цэнтральным Саветам ТДА-Авіяхіму БССР пастанавіў правесьці па ўсіх школах збор сродкаў на пабудову вучэбнага самалёту «Школьнік».

Кампанія па збору сродкаў будзе праходзіць з 20-га кастрычніка па 20 лістапада.

Забясьпечаньне БССР цукрам.

Маскоўская кантора Белкаапсаюзу ў бліжэйшыя дні падпісвае генэральны дагавор з цукратрэстам, па якому апошні павінен прадставіць для спажывецкай каапэрацыі БССР у працягу бягучага гаспадарчага году 800 вагонаў цукру.

Апрача гэтага, Маскоўская кантора Белкаапсаюзу заключае ўмову з цэрабсэкцыяй на завоз для рабочай каапэрацыі БССР у бягучым гаспадарчым годзе 370 вагонаў цукру, з якіх 294 вагоны пяску і 76 вагонаў рафінаду.

Падрыхтоўка да будаўнічага сэзону.

Белдзяржстрой пачаў рыхтавацца да будучага будаўнічага сэзону. У сучасны момант ужо вядуцца перагаворы з трэстамі і загатоўчымі арганізацыямі аб заўтаўцы будаўнічых матар'ялаў для будучага будаўнічага сэзону.

З буйных прац у бдучым будаўнічым сэзоне маркуюцца наступныя: пабудова фабрыкі штучнага шоўку і суперфосфатнага заводу ў Магілеве, Ільна-прадзільнага камбінату ў Ворны, трыкатажнай фабрыкі і абутковай фабрыкі ў Віцебску і 4 новых цагляных (уфанскіх) заводаў у розных округах БССР.

Апрача таго, маркуецца прыступіць да пабудовы воезда цэментнага заводу і 2 клінік і бібліятэк пры Унівэрсытэцкім Гарадку.

Пры ўмове, калі трэсты і Наркаматы своечасова заключаць дагаворы, дык да пабудовы вышэйазначаных фабрык і заводаў будзе прыступлена з 15-га красавіка.

Некаторыя дагаворы на будаўнічыя дэфіцытныя матар'ялы (цэмант, алебастр і інш.) ужо заключаны.

Усяго для гэтых пабудоў Белдзяржстрой заготовіць 40,000,000 штук цэгляў, 1,200 вагонаў цэманту, 8,500 тон розных металёвых тавараў.

У сярэдзіне у будучым будаўнічым сэзоне будзе занята каля 7,000 рабочых (у сёлетнім будаўнічым сэзоне занята 3,500 рабочых).

У Народным Камісарыяце Асьветы.

Народны Камісар Асьветы т. А. В. Балінкі 1 кастрычніка адбыў у чарговы водпуск. Выкананьне абавязкаў Народнага Камісара Асьветы часова ўскладзена на яго намесьніка т. П. П. Шастакова.

Да пабудовы кандытарскай фабрыкі.

У бліжэйшыя дні будзе разглядацца канчаткова ў навукова-тэхнічным савеце ў Маскве праект новай кандытарскай фабрыкі, якая будзе будавацца ў Менску.

Кошт фабрыкі абыйдзецца ў 1,600,000 р.

Фабрыка будзе будавацца на працягу 3 гадоў з такім разьлікам, каб пусьціць яе ў ход у кастрычніку 1931 г. На фабрыцы будзе занята да 450 рабочых.

Менскі дзень.

1000 руб. маркуецца адпусьціць у бягучым бюджэтным годзе для літоўскай і латыскай секцый пры клюбе Карла Маркса.

На 48 камплектаў павялічыцца сетка пачатковых школ Меншчыны. Апрача таго 2 чатырохгодкі рэарганізаваны ў сямёгодкі.

Камісію пад старшынствам тав. Філатава арганізаваў Менскі акрвыканком для правядзеньня сьвяткаваньня Дню Ураджаю.

Падрыхтоўка да дню ўраджаю.

З шэрагу раёнаў Менскай акругі паступаюць весткі аб тым, што раённы чынна рыхтуюцца да дню Ураджаю. На арганізацыю выставак і на выдачу прэмій кожны раён выдзяліў па 200 руб. Апроч гэтага, матар'яльны ўдзел прымаюць у выстаўках саўгасы, калгасы, каапэрацыя ды інш. арганізацыі.

Пуск новых масларобчых заводаў.

Учора, 3-га кастрычніка, пушчаны ў ход новыя масларобчыя заводы Белхарчтрэсту ў Магілеве, Бабруйску і Віцебску.

Праграма выпрацоўкі на бягучы гаспадарчы год намечана ў 3.500 тон масла і 8.500 тон макухі.

Паступленьне сыраў на заводы ідзе бесперабойна. У бягучым апэрацыйным годзе гэтыя масларобчыя заводы будуць працаваць у працягу 10-11 месяцаў.

Камунбанк пераходзіць у новае памяшканьне.

Беларускі Камунальны Банк 13 кастрычніка пераходзіць у новае памяшканьне на рагу Карла Маркса і Ленінскай. Апрача банку ў гэтым будынку будуць размешчаны аддзяленьне доўгатэрміновага крэдыту Прамбанку і аддзел, мясцовага бюджэту Менскага акрвыканкому. Гэты аддзел, згодна пастановы Саюзнага ўраду, з 1 кастрычніка перадаецца Камунбанку.

Хіміка-тэхнічнае аддзяленьне ў Віцебскім палітэхнікуме.

Нар. Ком. Асьветы БССР узбуджэў хадайніцтва перад Савнаркомам БССР аб адчыненьні пры Віцебскім Дзяржаўным Політэхнікуме хіміка-тэхнічнага аддзяленьня. У гэтым аддзяленьні мае быць прынята 30 асоб.

На ўтрыманьне студэнцтва і на абсталяваньне лябараторыі ў гэтым аддзяленьні патрабуецца 47.467 руб.

Усебеларускі зьезд саюзу працасьветы.

Прэзыдыум ЦП саюзу Белпрацасьветы паставіў склікаць на 17-га лістапада г. г. Усебеларускі зьезд саюзу працасьветы. На зьезьдзе будуць заслуханы палітычны даклад, справаздачы ЦК саюзу працасьветы, ЦП саюзу і рэвізійнай камісіі і даклад Нар. Ком. Асьветы БССР. На зьезьдзе адбудуцца выбары ЦП саюзу і рэвізійнай камісіі, а таксама выбары дэлегатаў на Усесаюзны зьезд саюзу працасьветы. Мандат прадстаўніцтва на зьезд устаноўлен—1 дэлегат на 200 сяброў саюзу.

Тэатральныя навіны.

Пастаноўка „Бронецягніка".

Пастаноўка п'есы „Бронецягнік" ужо закончана, і яна будзе пастаўлена хутка пасьля „Вераніён" Міровіча.

Падрыхтоўка балетнага вечара.

Балетмэйстэр т. Сямёнаў закончыў апрацоўку новай інтармэдыі да п'есы Мольера „Мешчанін дваранінам". Зараз тав. Сямёнаў рыхтуе працу для новага балетнага вечара, які будзе наладжан у канцы кастрычніка.

Арганізацыя драматычнай студыі.

Драматычная клас мутэхнікуму далучэнае да БДТ-1 і рэарганізуецца ў студыю з 4-хгадовым курсам навучаньня і 5-м годам для практыкаваньня.

З мэтаю запрашэньня настаўнікаў у студыю ў Маскву выехаў т. Самсанаў.

Пастаноўка опэры „Русалка".

Пастановаю НКА Дзяржаўная капэла прыкамандыроўваецца да опэрнай клясы Мутэхнікуму, пад кіраўніцтвам т. т. Ягорава і Сэляха.

Дзякуючы гэтаму вялікаму пры мутэхнікуме будзе стаць хор. У першай палове тэатральнага сэзону будзе пастаўлена опэра «Русалка», у якой будзе прымаць удзел Дзяржаўная капэла.

Запрошан новы выкладчык аркестровай клясы.

Дырыжэр студыі Станіслаўскага т. Брауэр прыслаў сваю згоду працаваць настаўнікам опэрнай і аркестровай клясаў Белмутэхнікуму.

Таксама вядуцца перамовы з вядомым кампазытарам Лавчанка (Ленінград) аб запрашэньні яго выкладчыкам у клясу кампазыцыі.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 4-X,—спэктакль нац. артыстаў Расейскай драмы: будзе пастаўлена пьеса «ПРИГОВОР».

Пачатак а 9 гадз. ув.

Білеты—ад 15 да 50 кап.

— АПА Гаррайкому КП(б)Б паведамляе, што з прычыны сходу партактыву, з кастрычніка заняткаў у адзінай партшколе ня будзе.

Чарговыя заняткі адбудуцца ў панядзелак 8-X а 7-й газэціе ўвечары.

ГАРРАЙКОМ КП(б)Б.

— Сёньня, а 8 гадзіне ўвечары, у анта вай залі Камвузу адбудзецца дачынены сход побчаства марнасьтаў БССР (усіх сэкцый).

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

НА 4-X-1928 г.

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—76,5, куп. 4—74,5.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—12, куп. 5—10.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—2, куп. 5—00.

Абл. 10 пр. паз. 27 году — прад. 25,40, куп. 25—30.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 121, 75, куп. 119,75.

Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 104—15 куп. 104—10.

ПА ПОЛАЧЧЫНЕ*).

У акруговай кузьні грамадзкай думкі.

5-га верасьня 1927 г. акруговая газэта „Чырвоная Полаччына" ў № 69(428) зрабіла мясцоваму камгасу і гарсавету заўвагу. У аддзеле «Па гораду» камгас і гарсавет маглі-б прачытаць наступнае:

«ТРЭБА ПАПРАВІЦЬ».

Вуліца рога Бухарына і Льва Талстога, дзе знаходзіцца Ваенкамат, тратуар, які праходзіць па вуліцах зусім ня мае ніякага выгляду, бо тратуар, як балота, чырвонаармейцы якія праходзяць па гэтай вуліцы лаюць гарадзкі савет і камунальную гаспадарку, якія да гэтага часу не прыступаюць да рамонту гэтага тратуара, дзе можна іншы раз застацца каленай, бо там знаходзяцца такія выграбы, дзе можна зламаць сабе ногу.

Трэба гарсавету і камунаддзелу зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэтую вуліцу, бо там праходзяць шмат людзей, як ноччу, так і днём, а таксама чырвонаармейцы, каб на было нешчасьлівых выпадкаў.

Місцыр.

Ці прачыталі гэтую заметку мясцовы камгас і гарсавет, ці не, зрабілі яны якія-небудзь арганізацыйныя выводы з гэтага, ці не зрабілі; я ня ведаю. Але я заметку прачытаў. Прачытаў і сумна мне зрабілася.

Шкада мне стала чырвонаармейцаў, а ізноў-жа і крыўдна за іх. Людзі жывуць у такіх небясьпечных абставінах, што ва ўсякую хвіліну могуць нагнаць сабе ногі, а аўтар заметкі Місцыр і за людзей ня хоча іх прызнаваць. Злосьць мяне разабрала і напоў я ў «Чырвоную Полаччыну» спрачанда — чаму дапушчае такое.

На першай старонцы ў загалоўку «Чырвоная Полаччына» асьцярожна намякае на свой адрас: «вугал Невельскай і Скарыны».

Але, калі вы прыехалі з вёскі, ці з другога гораду і вам трэба знайсьці рэдакцыю,—ня верце гэтаму адрасу: няма такіх вуліц у Полацку. Калісь былі, а цяпер—няма. Рэдакцыя зьмяшчаецца на рагу вуліцы Войкава (б. Невельская) і яшчэ нейкай, а вуліцы Стаўнова, якая. Рэдакцыю вы можаце знайсьці старым яывераным спосабам, які грунтуецца на прыказцы: «язык да Кіева давядзе». Гэтым спосабам, праблукаўшы з паўгадзіны, я знайшоў рэдакцыю. Крутыя ўсходы проста з вуліцы вядуць на другі паверх. З вузенькага цёмнага калідору я адчыняю маленькія дзьверы і ўваходжу ў невялікі пакой. 2 сталы, шафа і тэлефон.

— Тут рэдакцыя?—пытаюся.

— Тут.

— Уся?

— Уся.

— Не багата-ж у вас.

— Ды вось, як бачыце.

І запраўды я ўбачыў убогасьць. За двума сталамі два хлапцы і трэці дзядзька. Два хлапцы напружана скрабуць пер'ямі, а дзядзька, узброіўшыся ножніцамі, спрытна абстрыгае воддіскі і наклейвае іх на ліст паперы. Хлапцы—адзін сакратар, а другі—літаратурны праўшчык, а дзядзька—рэдактар. Ён жа і выпускаючы, ён-жа і матар'ял увесь праглядае, ён жа і на ўсе пасяджэньні і нарады ходзіць. Адным словам, гаспадарка аднаконная.

Газэта выходзіць два разы на тыдзень, мае тыраж каля 3-х тысяч экземпляраў.

— Чаму такі малы тыраж?

— «Беларуская вёска» і маскоўская «Крестьянская газета», як дзешавейшыя, выцясьняюць нашу газэту. Яны каштуюць па 15 к. на месяц, а наша—25 кап.

І гэта праўда. Селянін наш глядзіць на газэту яшчэ па яе цане: дзешавейшая, значыць і выпісаць можна.

«Чырвоная Полаччына» мае дапішчыкаў каля 600 чалавек, а выяўленых актывістаў-дапішчыкаў, якія пішуць больш-менш рэгулярна—350 ч. Гэта ўсё—дабраахвотнікі, якія пішуць у газэту бяз усякага ганарару, нават некаторыя і на паштовыя расходы нічога ня маюць ад газэты. Ганарару газэта наогул нікому ня плаціць. Такое бываюць такія выпадкі: заказвае рэдакцыя якому-небудзь акруговаму спэцу артыкул, а той цікавіцца:

— А колькі-ж вы мне заплаціце?

— Мы ганарару нікому ня плацім. Няма такога ў нас.

— Дык і пісаць ня буду.

І ня піша. А то бывае і так. Прыносе ў рэдакцыю акруговы аўтар артыкульчык і першым чынам:

— Колькі заплаціце?

— Нічога, няма грошы.

— Ну, дык бывайце здаровы. Я ў цэнтральную газэту пашлю—там заплацяць.

Пасылае. Там, канешна, плацяць, а свая акруговая газэта без матар'ялаў, і газэтныя працаўнікі прымушаны драць гэты матар'ял, адкуль прыдзецца. А самі пісаць—ці няма адпаведнай кваліфікацыі, ні часу няма, бо перагружаны яны да адказу.

З новага бюджэтнага году працаўнікі „Чырвонай Полаччыны" чакалі некатораго палепшаньня. Спадзяваліся, што ім пашырыць штат, дадуць трохі на ганарар. Яшчэ два працаўнікі ў газэце далі-б магчымасьць шырай карыстаць сялянскія лісты, хоць крыху зьвязацца з чытачом і дапішчыкам. У газэту піша палі 600 чалавек, а газэта зусім ня ведае свайго дапішчыка. Вучоты селькораў амаль што ніякага. На акрузе працуе 30 гурткоў селькораў; газэта з імі ня зьвязана, ніякага кіраўніцтва ім не дае. Працаўнікі газэтныя выяжджаюць на райёны рэдка: усяму віна адсутнасьць сродкаў і часу. Павялічэньне штату на двох працаўнікоў пры даных умовах працы рэдакцыі «Чырвонае Полаччыны» і пры той ролі, якую яна павінна адыгрываць, была-б зусім натуральная зьява, і працаўнікі рэдакцыі былі ўпэўнены, што сёлета штат у іх будзе пашыран. Але яны памыліліся. Сёлета бязьлітасна парэзалі каштарыс газэты—не далі ніякага павялічэньня:

— І так будзе добра.

Ішла «вайна за бюджэт», дык адзін з працаўнікоў, маючы блізкае дачыненьне да бюджэту, выказаў такі погляд:

— Што там, кажа, рабіць вам у газэце? Ды я пасаджу любога свайго канцэлярыста, і ён выпусьціць адзін газэту.

Бачыце, якія спрытныя канцэлярысты ў Полацку. Адзін газэту выпусьціць і «глазом не маргнёць».

Зразумела, пры такім погляде на рэдакцыйную працу, што яе можа выканаць любы канцэлярыст, няўхільны і тэндэнцыі зрабіць газэту філіалам любой акруговай канцэлярыі. І такія тэндэнцыі ёсьць.

